МТС БССР ВЫКАНАЛІ ПЛЯН СЯЎБЫ АЗІМЫХ

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Зьвязда

Орган ЦК і Мен. Гарксму Каму ністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 260 4165)
ЧАЦЬВЕР, 24 верасьня
1931 г.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА.

Усеагульная галадоўка палітвязьняў у польскіх турмах

Над турмамі фашысцкай Польшчы ўзьнёсся сьцяг галадоўкі. Тысячы палітзьняволеных арганізаваній масай узяліся за самую вострую зброю барацьбы, якою яны распараджаюцца ў турме, з тым, каб заклікаць УВЕСЬ ПРАЦОЎНЫ СЬВЕТ да дапамогі, пратэстаў і салідарных выступленьняў.

Фашысцкай сваволі пяройдзены ўсе магчымыя грані. Гаспадары капіталістычнага гмаху, які пачынае развальвацца, перад тварам грознай небясьпекі рэвалюцыі хапаюцца за апошні сродак барацьбы з мільёнамі працоўных. Мала крыві для фашызму. Невыстарчальнымі сталі зьдзекі і катаваньні рэвалюцыянераў. Невыстарчальны ўжо цяжкія турэмныя прысуды.

Забіваць, мучыць, расстрэльваць, душыць у цісках зьдзекаў, як сыстэмы, ПЕРАТВАРЫЦЬ УСЕ ТУРМЫ Ў МАГІЛЫ ЗАЖЫВА ПАХАВАНЫХ — вось, што задумаў фашызм. І далёка пакідаючы з-заду вядомыя ўсяму сьвету жахі Шлісэльбургу і Арлоўскай цэнтралі, усе прыгожасьці скрэднявяковых засьценкаў, пануючая зграя крывавай дыктатуры ўвяла закон, які пасіпен дзейнічаць, як СВАЯСАСЬЛІВАЯ ТУРЭМНАЯ ГІЛЬЁТЫНА. Ня выпусьціць ніводнага палітзьняка жывым са сваіх кіпцюроў, забіць у зьняволеным усё чалавечае, эраўняць яго з крымінальным злачынцам, увесьці ў сыстэму садызм турэмных катаў — вось лёзунг, вось мэта, якую ажыцьцяўляюць фашысты.

ЗАКОН УВЕДЗЕН. Цынічна цешыцца афіцыяльная прэса пануючай дыктатуры, якая закавала ў дыбы нячуванага тэрору ўсю краіну. — «Вось зараз мы здолеем задушыць рэвалюцыйны дух мас» — крычаць газэты. Сьледам за турэмным законам уведзены палявыя суды. — «Вось зараз мы здолеем адсячы галаву гідры рэвалюцыі» — крычаць фашысцкія і сацыял-фашысцкія пісакі.

АЛЕ АРМІЯ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ— ГЭТА АРМІЯ ЗАГАРТАВАНЫХ БАРАЦЬБІТОЎ. Дзесяць тысяч— гэта лепшыя сыны працоўнага народу, гэта самыя адважныя салдаты рэвалюцыі. І ў адказ на фашысцкі закон уся гэта армія папоўніцаў капіталу СЬМЕЛА ЎЗЬНЯЛАСЯ НА РЭДКУЮ Ў ГІСТОРЫІ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ РУХАЎ БАРАЦЬБУ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ЎСЕАГУЛЬНАЙ ГАЛАДОЎКІ.

Галадоўка пачата, гэта значыць, што дзесяць тысяч рэвалюцыянэраў выступілі на барацьбу за скасаваньне турэмнага закону. Гэта значыць, што яны ўзьняліся супроць фашысцкай сваволі, у абарону сваіх чалавечых правоў, супроць забойстваў і катаваньняў. Гэта значыць, што яны, наперакор усяму тэрору, ня гледзячы на ўсе ахвяры, якія вырве ў іх гэта барацьба, УСТУПІЛІ Ў СЬМЯРОТНЫ БОЙ З ВОРАГАМІ.

Упартая барацьба палітзьняволеных фашысцкай Польшчы — падзея вялізарнейшай палітычнай важнасьці. Яна адрастуць сілы рэвалюцыйных радоў. Яна цесна зьвязана з усім унутраным становішчам Польшчы, з усім мапутным РЭВАЛЮЦЫЙНЫМ УЗДЫМАМ, які там адбываецца.

Не таму, што фашызм стаў мацнейшым — ён уводзіць турэмны закон, ён заліває агнём і крывёю беларускія і украінскія вёскі, ён уводзіць палявыя суды. Не, тысячу раз не! Таму, што з кожным днём РАСТУЦЬ УПЛЫВЫ КАМУНІЗМУ ў краіне, таму што на грунце глыбокага крызісу мільёны асуджаных на голад ШУКАЮЦЬ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ ШЛЯХОЎ ВЫХАДУ з галечы, беспрацоўя і тэрору, таму, што зноў і зноў З УСЁЙ СІЛАЙ РАЗГОРТВАЕЦЦА СЬЦЯГ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧАЙ БАРАЦЬБЫ прыгнечаных народаў — фашызм ідзе на абвастрэньне тэрору.

Са СТРАХАМ перад узрастаючымі сіламі рэвалюцыі глядзіць фашысцкая дыктатура ў будучыню ў сувязі з надыходзячай зімой. Нават афіцыяльныя газэты пісудчыкаў прымушаны прызнаць, што гэта ЗІМА, ЯКАЯ ПРЫНЯСЕ ЯШЧЭ БОЛЬШАЕ ЗАВАСТРЭНЬНЕ КРЫЗІСУ, а ў сувязі з гэтым вялізарнейшы рост голаду і галечы мільёнаў насельніцтва, будзе ПЭРЫЯДАМ БУЙНЫХ КЛЯСАВЫХ БАЁЎ. Адна з фашысцкіх газэт, робячы параўнаньне сучаснага становішча з 1920 годам, трывожна заяўляе: «У гэту бліжэйшую зіму нам прыдзецца правесьці бой далёка больш вялікі і далёка больш небясьпечны для пёсаў нашай краіны, чым бойка над Віслай у 1920 годзе. І зусім яшчэ невядома, чым скончыцца гэты бой, які нам прыдзецца весьці ўжо ня толькі над аднэй Віслай, але над усімі рэкамі ўсёй краіны».

Ня сілы рэвалюцыі, а сілы фашызму сталі слабейшымі за гэты час. Ня сілы фашызму, А СІЛЫ РЭВАЛЮЦЫІ РАСТУЦЬ ВА ЎСЁЙ ПОЛЬШЧЫ, ПАЛОХАЮЧЫ СВАІМ РОСТАМ ДЫКТАТУРУ ПАЛКОЎНІКАЎ І ГЕНЭРАЛАЎ. І іменна як непасрэдны разультат гэтага рашаючага моманту ў вацэнцы ўнутранога становішча краіны, мы бачым — палявыя суды, турэмныя законы, масавыя забойствы галодных рабочых і сялян.

Але ліхаманкавыя мерапрыемствы польскага ўраду ня першыя ў гісторыі клясавага змаганьня. Ня першымі ў гісторыі зьняўляюцца намеры буржуазнай дыктатуры штыхамі і крывёю, карнымі экспэдыцыямі і турмой затрымаць рух мас і барацьбу іх за хлеб і работу, свабоду і ўладу. Сьвежа яшчэ ў памяці гісторыя расійскага царызму, які захлынуўся ў крыві сваіх уласных ахвяр і БЫЎ ЗМЫТЫ МАГУТНАЙ ХВАЛЯЙ ВЯЛІКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ.

Пустазвонная дэмагогіяй гучаць патэтычныя заявы аднаго з кіраўнікоў фашысцкага блёку Польшчы МЕДЗІНСКАГА на нядаўным сходзе фашысцкіх паслоў у Вільні аб тым, што ў Польшчы — «абсалютны спакой» і што ў Польшчы «адсутнічаюць якія-небудзь масавыя рухі». Разьлічаныя на заграніцу гэтыя фразы ня могуць утаіць, што ў краіне няўхільна РАСЬЦЕ ЗАБАСТОВАЧНЫ РУХ рабочае клясы, што польскае СЯЛЯНСТВА ўсё больш востра выступае супроць памешчыкаў і паліцыі, што ўсё больш частымі становяцца такія факты, як вядомыя падзеі ў Вялунскім павеце, калі польскія сяляне на працягу некалькіх дзён вялі ўпартую барацьбу з паліцэйскімі атрадамі, што, ня гледзячы на «пацыфікатарскія» мерапрыемствы акупантаў, абвастраецца вызваленчы рух прыгнечаных народаў.

У гэтай абстаноўцы гераічная барацьба палітзьняволеных ня будзе ІЗАЛЯВАНЫМ выступленьнем адважнага рэвалюцыйнага авангарду. ЯНА БУДЗЕ ПАДТРЫМАНА ПРАЦОЎНЫМІ ЎСЁЙ ПОЛЬШЧЫ. Бо дзесяць тысяч палітвязьняў адлюстроўваюць інтарэсы народу, які змагаецца. Яны нясуць сьцяг усіх прыгнечаных і падняволеных. Яны перадаюць барацьбіты, за вызваленьне якіх змагаюцца мільёны і на месца якіх гэтыя мільёны высоўваюць усё новую і новую зьмену.

АДЗІН З ЛЕПШЫХ АТРАДАЎ КАМІНТЭРНУ — Камуністычная Партыя Польшчы, наперакор палявым судом і абвостраным рэпрэсіям фашыстаў, мабілізуе найшырэйшыя масы працоўных на барацьбу за вызваленьне палітзьняволеных, супроць турэмнага закону, супроць фашысцкага тэрору, ВЯДУЧЫ МАСЫ ПРАЗ ШТОДЗЕННЫЯ БАІ ДА РАШАЮЧЫХ БАЁЎ ЗА ЎЛАДУ.

«На дапамогу» — нясецца воклич з турмаў фашысцкай Польшчы.

«МЫ З ВАМІ» — адказвае ўся шматмільённая наша краіна — краіна будаўнікоў сацыялізму. — МЫ З ВАМІ НЯ ТОЛЬКІ СЛОВАМ, АЛЕ І СПРАВАЙ. Уся нашы сілы, усе нашы сродкі мы аддамо для таго, каб дапамагчы вам у вашай цяжкой барацьбе. Але разам і побач з гэтым мы выконваем свой абавязак перад вамі тым, што яшчэ цьвярдзей, яшчэ больш упарта будзем ісьці наперад і змагацца за ажыцьцяўленьне тых вялікіх мэт, да якіх імкнецеся вы і якіх вы дасягнеце.

ПАД БАЯВЫМІ СЬЦЯГАМІ КАМУНІСТЫЧНАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ ПЕРАМОГА БУДЗЕ НЯМІНУЧА ЗА НАМІ!

Не аслабляць барацьбы за высокую ўраджайнасьць

Трактарную цягавую сілу пераключыць на зяблёва і ворыва цаліны

ЗАБЯСЬПЕЧЫМ ПОСЬПЕХ ТРЭЦЯЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ!

ПЕРАМОГА МТС

Сакратару ЦК КП(б)Б—т. Шыранговічу
Наркамзему БССР—т. Рачыцкаму
Старшыні Белкаласцэнтру—т. Міцькову
Рэдакцыі газэты „Зьвязда“

Рапарт

Баявая задача, пастаўленая партыяй і ўрадам перад МТС БССР па правядзеньні ўборкі і азімай сяўбы, выканана.

МТС БССР пад кіраўніцтвам КП(б)Б і яе пенінскага ЦК пры напружанай работе калгасьнікаў, трактарыстаў, рабочых і агрэтэхнічнага пэрсаналу, рашуча дабіваючы кулацкія рэшткі, наперакор разважаньням правых апартуністаў і «левых» загібшчыкаў, на падставе рашучага ўкараненьня зьдзельшчыны, разгорнутага сацспаборніцтва і ўдарніцтва, а таксама на базе ўзрастаючай машыннай тахнікі, на 20 верасьня пляны выканаў:

МТС УБРАЛІ 123.354 ГА ЯРАВЫХ ЗБОЖЖАВЫХ, ЦІ НА 100,1 ПРОЦ.
43.079 ГА ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР — 103,8 ПРОЦ.
ПЛЯН АЗІМАЙ СЯЎБЫ Ў 118.330 ГА ВЫКАНАН НА 101,3 ПРОЦ.

СЯЎБА АЗІМЫХ МТС ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАБОДЛЕ СУСТРЭЧНАГА ПЛЯНУ КАЛГАСАЎ.

Не аслабляючы тэмпаў па перавыкананьні плянаў, МТС пераключыліся на ўздым зяблевага ворыва і цаліны, на хутчэйшую першапачатковую апрацоўку ільняной продукцыі, выкананьне пляну сіласаваньня і хутчэйшую здачу дзяржаве збожжавых пішкаў і тавараў ільняной продукцыі з павышэньнем якасных паказальнікаў ва ўсёй рабоце.

Рапартуючы аб гэтым, Белартрактарацэнтр падкрэсьлівае значнае перавыкананьне пляну азімай сяўбы асобнымі МТС і заносіць іх у кандыдаты для прэміраваньня: ЛЕПЕЛЬСКУЮ МТС, якая выканала плян сяўбы на 191 проц., МСЬЦІСЛАЎСКУЮ МТС, якая выканала плян сяўбы на 168,4 проц., ГОРАЦКУЮ МТС, якая выканала плян сяўбы на 150,4 проц., і КАПЫЛЬСКУЮ МТС, якая выканала плян сяўбы на 141 проц.

УПАЎНАВАЖАНЫ ТРАКТАРАЦЭНТРУ ПА БССР КАРШАКЕВІЧ.
СТАРШЫ АГРАНОМ КОРЗЕНКА.

Саўгас „Лучыца“ скончыў сяўбу

КАПАТКЕВІЧЫ. (Па тэлеграфу). Саўгас «ЛУЧЫЦА», Пятрыкоўскага раёну, плян сяўбы ў 90 гэкт. выкапаў 16-га верасьня.

Дырэктар саўгасу Харланчук.

Адсутнасьць зьдзельшчыны зрывае асеньнюю сяўбу

ЛЁЗНА, Хоць Лёзьнянскі раён у асноўным скончыў асеньнюю сяўбу, але-ж у некаторых калгасах ёсьць буйны прарыў на гэтым фронце.

Калгасу «Новае жыцьцё» трэба засеяць 136 гэктараў азімых, а засеяна толькі 56. Апрача гэтага ў калгасе стаіць наўбраным 30 гэктараў ільну.

Гэта тлумачыцца тым, што зьдзельшчына ў калгасе ўведзена толькі фармальна, улік працы пастаўлен дрэнна. Ковуе абязьлічка. У выніку гэтага працэдысцыпліна адсутнічае. З 180 працаздольных на працу выходзіць толькі 70-80 чалавек. На фрэту выходзяць позна.

Брыгада шматтыражкі «Чырвоная Дзьвіна»: БАРАВІК, АФАНАСЬЕЎ І ХАДАРЧЭНКА.

Слуцкая МТС не пераключылася на зяблёва

СЛУЦАК. Кіраўніцтва Слуцкай МТС не пераключыла ўвагі калгасьнікаў на пасьняховае выкананьне пляну асеньняй сяўбы. Па калгасах, якія абслугоўваюцца МТС, засеяна толькі 30,6 проц. пляну.

Яшчэ горшае становішча з уздымам зяблёва. Па пляне. МТС належыць узняць 8.000 гэктараў, а ўзьнята толькі 800 — 10 проц. пляну. Пастанова НКЗ і Калтасцэнтру СССР аб пераключэньні на зяблёва 80 проц. трактараў ня выканана.

Вельмі дрэнна скарыстоўваюцца трактары. Абязьлічка да гэтага часу не ліквідавана. Наглядаюцца прагулы трактарыстаў. Трактары не пераведзены на 3-зьменную работу. 4 трактары зусім выбылі са строю і ніякіх захадаў для найхутчэйшага іх адрамантаваньня ня прынята.

Беладдзяленьне Трактарацэнтру слаба дапамагае МТС у рабоце. Інструктары абмяжоўваюцца выключна кантраляваньнем работ і абыходзяць дапамогу.

Адміністрацыя і парт'ячэйка МТС павінна дабіцца ліквідацыі ўсіх прарываў. Завяршаючы сяўбу, трэба пераключыць тую колькасьць трактараў, якая вызначана Наркамземам на зяблёва. Трактарацэнтр павінен зьвярнуць увагу на працу Слуцкай МТС.

Жылка.

Засеялі толькі 60 проц. азімых

ВАРЫСАЎ. Пяцідзеньнік штурму асеньняй сяўбы, абвешчаны ЦК КП(б)Б, не ўзварушыў Варысаўскія раённыя арганізацыі і калгасы. На 20-га верасьня засеяна ўсяго 60 проц. азімага кліну. У асобных сельсаветах гэты процант яшчэ ніжэйшы.

Большасьць калгасаў раёну, ня гледзячы на дырэктывы РК КП(б)Б аб пераключэньні 30 проц. конскай цягавай сілы на зяблёва, гэтага ня робяць. Раённыя работнікі, якія накіраваны ў калгасы, не дапамагаюць у паладжваньні працы.

Барысаўпчына павінна неадкладна ліквідаваць прарыў у сяўбе.

Б. Барысаўскі.

Сыгналы друку ня ўлічаны

74 проц. азімага кліну пустуе

Вынік апартуністычнай практыкі

УВАРАВІЧЫ. «Зьвязда» пісала ўжо аб буйных прарывах у правядзеньні асеньняй сяўбы ва Ўраравіцкім раёне. Аднак, сыгналы друку раённымі арганізацыямі ня былі пачуты. На 20-га верасьня па раёне ледзь засеяна 26 проц. азімага кліну.

Канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва асеньняй сяўбой з боку раённых арганізацый і значнай часткі саветаў і партыйных ячэек па-ранейшаму адсутнічае. Напрыклад, Бацуноскі, Барвенаўскі, Змычкоўскі, Старабуцкі сельсаветы і інш., якія першымі павінны скончыць сяўбу, на 20-га верасьня толькі на палову выканалі свае пасеўныя пляны. Нават перадавыя і буйнейшыя калгасы раёну, як «Энгельс», «Камінтэрн», «Авангард» і інш., якія яднаюць сотні гаспадарак і якія з посьпехам спраўляліся з правядзеньнем веснавой сяўбы ў правядзеньні асеньняй сяўбы далі зьніжэньне тэмпаў, выканаўшы свае пляны ад 45 да 55 проц. У некаторых калгасах раёну («Палеская праўда» і іншых) на правядзеньне сяўбы вылучана па, тры пары коняй, што ні ў якім разе не забясьпечвае выкананьня плянаў у вызначаныя тэрміны.

Зусім відавочна, што дырэктывы партыі і савецка-калгасных кіруючых устаноў аб максымальным ушчыльненьні тэрмінаў сяўбы, раёнам ігнаруюцца. Райза і калгассаюз замест баявой работы па мабілізацыі вытворчай актыўнасьці калгасьнікаў і бядняцка-сераднякоў мас аднаасобнікаў на бальшавіцкае правядзеньне сяўбы, спасылаюцца на «аб'ектыўныя» прычыны. Раён пальцам аб палец ня ўдарыў, каб знайсьці правільныя шляхі арганізацыі і расстаноўкі людзей і цягавай сілы паміж рознымі работамі. У раёне да гэтага часу ня выканана дырэктыва аб пераклідцы 80 проц. трактараў і ня менш 30 проц. коняй на зяблёва.

Зяблёва, якое ў правядзеньні асеньніх работ павінна заняць адно з асноўных месц і мае рашаючае значэньне для ўзьнікцця ўраджайнасьці і скарачэньня тэрміну веснавой сяўбы 1932 г., амаль ва ўсіх калгасах раёну яшчэ не распачалося. Такое-ж становішча мы маем і сярод аднаасобнікаў.

Аднаасобнік зусім выпадае з-пад увагі раённых кіруючых устаноў.

У раёне рад калгасаў яшчэ на сёньняшні дзень ня мацуць насеньня для засеву азімых (Барвенаўскі, Змычкоўскі і інш.). Райкалгассаюз (таксама і РВК) усё яшчэ марыць аб стварэньні так званых страхавых фондаў, у той час, як тэрміны сяўбы ўжо прайшлі.

Выкананьне плянаў асеньняй сяўбы ва Ўраравіцкім раёне ганебна зрываецца. Буйныя прарывы ў радзе саветаў і калгасаў раёну — самы выразны паказальнік апартуністычнай практыкі і бязьдзейнасьці раённых кіруючых устаноў. РК КП(б)Б неадкладна павінен ужыць рашучыя захады, мабілізаваць усю раённую партарганізацыю на ліквідацыю прарываў, якія ёсьць у асеньняй сяўбе і неадкладнай пераклідцы вызначанай колькасьці трактараў і пятаваў сілы на правядзеньне ворыва зяблёва прыцягваючы да суровай адказнасьці апартуністаў, якія зрываюць выкананьне бальшавіцкіх плянаў, граюць на руку клясаваму ворагу.

Спэцыяльная брыгада «Зьвязды».

Аб чым думае Дубровенскі парсуд

ДУБРОЎНА. Калтасны сэктар Верацейскага сельсавету скончыў сяўбу азімых 15-га верасьня. Плян сяўбы выканан на 102 проц.

Зусім іншая справа з сяўбой у аднаасобным сэктары. Адпаасобнікі значна адсталі ў сяўбе.

Апрача таго, некаторыя кулацка-заможныя гаспадаркі сьвядома зьмяншаюць пасеўны клін.

Верацейскім сельсаветам яшчэ 3-га верасьня накіраваны парсуду акт і пастанова сельсавету аб прыцягненьні да судовай адказнасьці 4 кулацка-заможных гаспадарак, якія ня выконваюць цьвёрдых заданьняў па сяўбе. Парсуд да гэтага часу яшчэ не разгледзеў гэтай справы і не прыцягнуў іх да адказнасьці

Балтуноў.

Да І-га кастрычніка—закласьці бульбянік у сіласныя ямы

ЦКК-РСІ аб ходзе сіласаваньня

21-га верасьня аб'яднанае пасяджэньне прэзыдыуму ЦКК і калегіі НК РСІ БССР абгаворвала пытаньне выкананьня пляну сіласаваньня.

Праведзеная праверка ходу сіласаваньня і выкананьня пляну паказала, што Наркамзем Беларусі і іншыя цэнтральныя гаспадарчыя арганізацыі не кіравалі гэтай работай і не правяралі, ці на мясцох выконваюцца дырэктывы.

З боку РАЙВЫКАНКОМАЎ і раённых каапэрацыйна-калгасных арганізацый працулена яўная НЕДААЦЭНКА мерапрыемстваў па сіласаваньні.

Большасьць кіраўнікоў саўгасаў і асабліва калгасаў ігнаравалі дырэктывы, якія даваліся кіруючымі арганізацыямі, і сталі зьмяншаць пляны па сіласаваньні.

Плян па сіласаваньні па БССР выканан на 12 проц., плян будаўніцтва— на 25,9 проц., а будаўніцтва стандартных сіласных веж — на 47,2 проц. у адносінах да завезеных у калгасы і саўгасы вежаў.

Адзначыўшы такія буйныя прарывы прэзыдыум ЦКК і калегія НК РСІ з мэтай выкананьня пляну па сіласаваньні прапанавалі НКЗБ і цэнтральным гаспадарчым арганізацыям забясьпечыць раёны апэрацыйным кіраўніцтвам, а раённым арганізацыям правесьці ў жыцьцё ўсе намечаныя мерапрыемствы, каб для сіласаваньня быў цалкам скарыстан ўвесь бульбянік, адкіды гароднінь і атава лугавых траў.

Сіласаваньне бульбяніку павінна скончыцца да 1-га кастрычніка, а ўсіх іншых траў — да 15-га кастрычніка.

Белкалгасцэнтру, саўгасам і райкалгассаюзам прапанавана забясьпечыць поўную нагрузку ўсіх сіласарэзак на працягу 18 гадзін у суткі, пры двух зьменнай працы на аснове зьдзельшчыны і прэміяльнай аплаты.

Будаўніцтва сіласных установак павінна быць скончана не пазьней 1-га кастрычніка.

НКЗБ і Белсельгасснаб павінны неадкладна забясьпечыць гэтае будаўніцтва патрэбнымі матар'яламі. Гомсельмашу прапанавана да 1-га кастрычніка адгрузіць усе сіласарэзкі па нарадах Белсельгасснабу.

Справа аб скарыстаньні не па прызначэньні 3-х сіласных веж з боку МЦРК, саўгасу «Доўгалесьсі» і керамічнага трэсту ў Гомелі, перадана пракуратуры для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

Усім райКК-РСІ прапанавана сачыць за выкананьнем даных дырэктыў і вінаватых у невыкананьні іх прыцягваць да суровай адказнасьці.

Прэзыдыум ЦКК-РСІ вызначыў мерапрыемствы для забесьпячэньня пасьняховага выкананьня пляну будаўніцтва сіласных установак і на 1932 г.

Бяз уліку нельга правільна разьмеркаваць даходы

КАЛГАСЬНІКУ-УДАРНІКУ—ГАЛОЎНУЮ УВАГУ

НЯ ДАЦЬ ГУЛЬТАЮ ПАЖЫЦЬ ЗА РАХУНАК ЧУЖОЙ ПРАЦЫ

РАЗЬМЯРКОВУЮЧЫ УРАДЖАЙ ТОЛЬКІ ПА ВЫТВОРЧЫМ ПРЫНЦЫПЕ, НАНЯСЕМ РУИНУЮЧЫ УДАР ПА КУЛАКУ І ЯГО ДАПАМОЖНІКАХ—ГУЛЬТАЮ І ПРАГУЛЬШЧЫКУ

Калгасы „Полымя“, „Новае Бутава“ і „Чырвоная Дуброва“ павінны неадкладна вытравіць з практыкі сваёй работы кулацкую ўраўнілаўку

ПРАВІЛЬНА РАЗЬМЯРКУЕМ УРАДЖАЙ

Наркамзем СССР тав. Якаўлеў выразіла заявіў:

«Чалавек, які не працуе, ня можа прэтэндаваць на атрыманьне хлеба, а калгасьнік, які сапраўды сумленна працаваў, які выпрацаваў большую колькасьць працадзён, атрымае больш і хлеба і кармоў і грошай».

Гэтага аспэктнага прынцыпу яшчэ не зразумеў рад калгасаў, не зразумелі некаторыя раённыя арганізацыі. Факты гавораць за тое, што нават не ва ўсіх калгасах распрацавана пастанова Наркамзему і Калгасцэнтру СССР аб прыкладным разьмеркаваньні ўраджаю. Зразумела, што гэта скарыстоўвае кулак, які ўпарта агітуе за ўраўнілаўку, за разьмеркаваньне збожжа па едаках. Апартуністы, праводзячы ўраўнілаўку ў сваёй практычнай рабоце, аказваюць непасрэдную дапамогу кулаку. Замест рашучай барацьбы з кулацкімі прыцыпамі разьмеркаваньня даходаў некаторыя праўленьні калгасаў самі сталі на шлях кулацкай ураўнілаўкі пры выдачы авансаў калгасьнікам.

Згодна пастановы Наркамзему і Калгасцэнтру БССР да 15-га кастрычніка трэба раздаць 50-75 проц. як натуральных, так і грашовых прыбыткаў, якія належыць атрымаць калгасьніку. У часе выдачы авансаў трэба асабліва пільна на сачыць за выкананьнем лёзунгу: «атрымлівае больш той, хто больш і лепш працуе». Толькі пры ўмовах правільнай выдачы авансаў з посьпехам можна будзе закончыць асеньнюю сяўбу, уборку бульбы, малацьбу і г. д. Між тым, ужо маецца рад калгасаў, якія грабілі грубыя парушэньні дырэктыў партыі і ўраду, якія замест выдачы аванс ў па працадзнёх, фактычна скаціліся ў нічым ніпрыкрытай ураўнілаўку.

Так, у калгасе «ПОЛЫМЯ», Клімавіцкага раёну, Міхневіч Янка за 170 працадзён атрымаў 10 пуд. збожжа, а Васільеў Кандрат за 364 працадні толькі 6 пуд. У калгасе «НОВАЕ БУТАВА», Вушацкага раёну, выдалі па 30 кгр. муукі на кожнага едака. У калгасах Сумакавіцкага сельсавету (Мазырчына) падушна падзялілі муку, падушна зьбіраюцца давяць бульбу. Шмат якія калгасы ўстанавілі месячную пайковую норму і г. д.

Зусім зразумела, што такое разьмеркаваньне на руку кулаку, яно аслабляе працоўную дысцыпліну, зьніжае прадукцыйнасьць працы калгасьніка. Наадварот, там, дае авансы выдаюць па працадзнёх, дысцыпліна яшчэ больш узьнімаецца, выхад калгасьнікаў на працу павялічваецца.

Зараз, калі прыступілі да канкрэтнай работы па выдачы авансаў, кожны работнік зразумеў, што без правільнага уліку працадзён, немагчыма правільна разьмеркаваць ураджай. Да 20-га верасьня трэба было ўлічыць усе выпрацаваныя працадні кожнага калгасьніка, рэвізійныя камісіі павінны былі правяраць правільнасьць запісаў, даходзячы аб гэтым на агульных сходах. Аднак, дырэктыва да гэтага часу ня выканана, вельмі малы процант калгасаў правёў поўны ўлік працадзён.

Неабходна пакончыць з апартуністычнай недаацэнкай пытаньня своячасовага і правільнага разьмеркаваньня ўраджаю. Да 15-га кастрычніка, не пазьней, кожны калгасьнік павінен атрымаць 50-75 проц. тых прадуктаў і грошай, якія яму належаць згодна выпрацаваных працадзён за 1931 год.

Раённыя арганізацыі могуць і павінны мабілізаваць увесь рахунковы апарат і кінуць яго на некаторы прыяд у калгасы для паладжваньня уліку працадзён і даходаў.

Рашуча змагаючыся з кулацкай ураўнілаўкай, з апартуністычнай недаацэнкай важнасьці кампаніі па разьмеркаваньні ўраджаю, мы разьмяркуем ураджай у кожным калгасе толькі па колькасьці і якасьці працы кожнага калгасьніка.

Ураўнілаўка квітнее

ВУШАЧЫ. (Наш кар.).

На радзе калгасаў раёну авансы выдаюцца не па якасьці і колькасьці працы кожнага калгасьніка, а па едаках і гаспадарках.

У калгасе імя Дзяржынскага палуе думка, што «пакуль трэба выдаваць усім па 20 пудоў хлеба на гаспадарку». У калгасе-ж «НОВАЕ БУТАВА» кажуць: «бяз хлеба нікога не пакінем» і на практыцы ажыцьцявілі кулацкую ўраўнілаўку — выдалі па 30 кгр. мукі на едака.

У калгасе «Пралетары» гультаём і прагульшчыкам авансы выдаюцца ў першую чаргу. Мароз Марыля за 16 працадзён атрымала 35 руб. авансу, другія за 100 працадзён набралі авансаў на 120-150 руб.

Выдача авансаў і разьмеркаваньне ўраджаю на едаках і гаспадарках тлумачыцца тым, што Вушацкі райкалгассаюз зусім не падумаў аб паладжваньні ўліку працы ў калгасах, не растлумачыў калгасьнікам пастаноў Калгасцэнтру і Наркамзему БССР аб прыкладным разьмеркаваньні ўраджаю.

Вушацкія раённыя арганізацыі павінны тэрмінова выправіць памылкі калгасаў, рашуча ўдарыць па тых, хто окажае дырэктывы партыі і ўраду, мабілізаваць усе сілы па ўлік і ўпарадкаваньне запісу працадзён і выдаваць авансы выключна на прынцыпе — хто больш і лепш працуе, той больш атрымлівае.

Ян. Ліпаўка.

Па едаках дзеляць муку і бульбу

МАЗЫР. У калгасах «Новае Запольпе» і «Чырвонае Дуброва» Сухавіцкага сельсавету адсутнічае ўлік працы. У працоўным кніжкі апошні запіс зроблен у лістпе. Выдача авансаў прадуктамі робіцца не ў залежнасьці ад выпрацоўкі, а па едаках. Так, па прынцыпе кулацкай ураўнілаўкі, у калгасе «Чырвонае Дуброва» падзялілі муку, а ў калгасе «Новае Запольпе» пачынаюць дзяліць бульбу.

Трэба неадкладна выправіць гэтыя скажэньні ў разьмеркаваньні ўраджаю.

С. М.

Пад суд за злачынства пры разьмеркаваньні авансаў

КЛІМАВІЧЫ. У калгасе «ПОЛЫМЯ» дзякуючы апартуністычнай блізарукасьці як парт'ячэйкі, так і сельсавету, разьмеркаваньне хлебных авансаў рабілася на кулацкім прынцыпе. Калгасьнікі, якія маюць больш працадзён, атрымалі менш і наадварот, за менш працадзён выдан хлебны аванс у большым разьмеры. Вось прыклады.

Ласоўскі Рыгор за 325 працадзён атрымаў 11 пудоў хлеба, Пясьляк Несьцер за 388 працадзён — 5 пудоў, Міхневіч Іван за 170 працадзён — 10 пудоў, а Васільеў Кандрат за 364 працадні — 6 пудоў.

Хлеб у першую чаргу атрымалі сваякі калгаснай адміністрацыі. Пры выдачы авансаў мела месца простае злачынства. Кладаўшчык Пясьляк Янка сваяком павялічыў норму хлеба супроць той, якая была вызначана. Той-жа кладаўшчык Пясьляк, раздаючы хлеб, казаў: «бярэце жыта колькі каму трэба, у нас яго хопіць».

Старшыня калтасу Жарыкаў (член партыі) склаў яўна фальшывы акт, у якім зафіксавана, што 1 гэктар дае 12 пудоў жыта, у той час, як у сапраўднасьці з 1 гэкт. намалочана 24 пуды.

Сабраўшы жыта звыш 4 тыс. пудоў і раздаўшы калгасьнікам авансам 680 пудоў, калгас дае заяўку райкалгассаюзу на 200 пудоў жыта на насеньне, а старшыня калгасу Жарыкаў заяўляе: «дадуць жыта, будзем сеяць, не дадуць — сеяць ня будзем».

На гэтыя вылазкі клясавага ворага ў калгасе «Полымя» ні сельсавет, ні парт'ячэйка не рэагавалі. Неабходна аддаць пад суд злачынцаў і кулацкіх агентаў, якія дэзарганізуюць калгасную гаспадарку.

В. БАЛЬЗОЎСКІ.

Салікамскія калійныя капальні і прадпрыемствы (Урал), якія ў 1932 г. дадуць 1.000.000 тон штучных угнаеньняў калгасным і саўгасным палём

175.000 тон бульбы—Ленінграду

Раўняцца па калгасе „Чырвоная Ніва“

ЁН ПЕРШЫ ВЫКАНАЎ АБАВЯЗКІ ПЕРАД ПРАЛЕТАРАМІ ЛЕНІНГРАДУ, ПОУНАСЬЦЮ РЭАЛІЗАВАЎШЫ СВАЁ ЗАДАНЬНЕ ПА АДГРУЗЦЫ БУЛЬБЫ

БЛІСКУЧЫ ПРЫКЛАД

Касьцюковічы, 23. (БЕЛТА).

Калгас „Чырвоная ніва“ першым у БССР поўнасьцю выканаў плян адгрузкі бульбы Ленінграду. Калгас адгрузіў 1.170 цэнтн. бульбы.

Посьпехі дасягнуты дзякуючы ўдарнай працы калгасьнікаў. Калгасы БССР павінны ўзяць прыклад з калгасу „Чырвоная ніва“.

У БССР недапушчальна зьніжаюцца загатоўкі бульбы і гароднінны

Пастанова Цэнтрасаюзу

МАСКВА, 23 верасьня. Прэзыдыум Цэнтрасаюзу адзначыў недапушчальнае зьніжэньне загатовак бульбы і гароднінны ў Беларусі, ЦЧВ і па Паўночным Каўказе. У пастанове гаворыцца, што асноўнымі прычынамі дрэннага ходу загатовак зьяўляецца невыстарчальнае разгортваньне арганізацыйнай работы, затрыманьне ў капаньні бульбы, асабліва па БССР.

Таму прэзыдыум Цэнтрасаюзу прапанаваў Белкаапсаюзу і спажыўсаюзам ЦЧВ і Паўночнага Каўказу ўстанавіць асобны нагляд і кіраўніцтва пад раёнамі, якія зьяўляюцца асноўнымі загатоўшчыкамі бульбы і гароднінны

(ТАСС)

Ударнымі тэмпамі

КРУПКІ.

Крупскі раён па-бальшавіцку ўзяўся за выкананьне дырэктыў партыі і ўраду аб загатоўцы і адгрузцы бульбы пралетарскім цэнтрам. Дзякуючы актыўнаму ўдзелу мас калгасьнікаў, бяднякоў і сераднякоў у бульбазагатоўчай кампаніі райспажыўсаюз адгрузіў Ленінграду: 18 верасьня — 4 ВАГОНЫ, 19 і 20 — 11 ВАГОНАЎ. Загатоўка і адгрузка бульбы разгортваецца ўзмоцненымі тэмпамі.

С. Д.

„АДГРУЗКА БУЛЬБЫ— НЯ НАША СПРАВА“

ЛЁЗНА.

Адгрузка бульбы пралетарскім цэнтрам не разгорнута належнымі тэмпамі. Наводле пляну Лёзьнянскі раён павінен адгрузіць 7.000 тон бульбы. На 20 верасьня загатоўлена толькі 12.175 цэнтнераў, што складае 17 проц. пляну. З загатоўленай бульбы 53 цэнтн. яшчэ ляжаць на

9-ы АБ'ЯДНАНЫ РЭЙД УДАРНІКАЎ „ПРАВДЫ", „ЗЬВЯЗДЫ" і „САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ"

Гародніна не даходзіць да спажыўца

Белсаўгастрэст, Белсадсаюз, Белплодагародніна працуюць усьляпую

У гароднай гаспадарцы БССР сёлета дасягнуты значныя посьпехі. Пад гародамі ў калгасах і саўгасах заняты дзесяткі тысяч гектараў. Спажывецкая кааперацыя з дапамогай рабочай грамадзянасьці разгарнула ў прыгарадных кааперацыях вялікую работу. Уроджай у гародных гаспадарках, наогул, дае магчымасьць ПОЎНАСЬЦЮ ЗАДАВОЛІЦЬ ГАРОДНІНАЙ НЯ ТОЛЬКІ РАБОЧАЕ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ, АЛЕ І ВЫВЕЗЬЦІ ЗНАЧНУЮ КОЛЬКАСЬЦЬ ДЛЯ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ ПРАЛЕТАРСКІХ ЦЭНТРАЎ САЮЗУ.

У тэмпах уборкі, загатоўкі і рэалізацыі гародніны не адчуваецца трывогі. Тара, хавальні для гародніны не падрыхтаваны. Перапрацоўка не разгорнута.

Ніводнага кілёграма гародніны не павінна застацца на полі!

Зразумела, што для выкананьня гэтай задачы патрабуецца дакладная і выразная работа ўсіх зьвеньняў спажывецкай кааперацыі, Белплодагародніны, Белсадсаюзу, Белсаўгастрэсту, Белкаргасцэнтру, Белсампрамсаюзу, Белтары, транспарту.

Ці выканалі паказаныя арганізацыі ўскладзеныя на іх партыяй і ўрадам задачы па бесьперабойным забесьпячэньні рабочых гародніной?

ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ ЎСЕБЕЛАРУСКАГА РЭЙДУ ЎДАРНІКАЎ «ПРАВДЫ», «ЗЬВЯЗДЫ» і «САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ», праведзенага на Менску 20-ГА ВЕРАСЬНЯ, сьведчаць аб тым, што, як ужо ня раз сьцьвярджалася «Зьвязда», некаторыя арганізацыі, замест ударных тэмпаў, праявілі САМАЦЁК, БЕЗАДКАЗНАСЬЦЬ, БЯСПЛЯНАВАСЬЦЬ. У выніку ў пасобных рабочых раёнах стварыліся перабоі ў забесьпячэньні гароднінай і фруктамі.

Матар'ялы рэйду, якія мы сёньня друкуем, патрабуюць безадкладнага выпраўленьня і ліквідацыі на хаду ўсіх памылак і недарэчнасьцяй, фактаў безгаспадарчасьці і безадказнасьці, якія выявіліся ва ўборцы, загатоўках, рэалізацыі і перапрацоўцы гародніны. Рабочыя павінны быць забясьпечаны гароднінай ня толькі цяпер, але і на зіму. Матар'ялы перададзены ў ЦКК НК РСІ для прыняцьця адпаведных мер. Пракуратура павінна таксама безадкладна заняцца расьсьледаваньнем шматлікіх фактаў псаваньня гародніны і наогул шкодніцкіх адносін з боку работнікаў некаторых арганізацый да патраб спажыўца. Вінаватыя ў гэтым павінны панесьці суровую кару.

* *

Па саўгасах Белсаўгастрэсту плян уборкі ранняй капусты выкананы на 53,92 проц., раньняй бульбы — на 40,8 пр.ц., гуркоў — на 48 проц., яблык і груш — на 13,3 проц. Белсаўгастрэст зусім ня ведае аб сапраўдным станавішчы ў саўгасах. Апэрацыйнага кіраўніцтва няма. У адным толькі саўгасе «Заціша» ляжыць без руху каля 33 тон памідораў, каля паловы ўжо згніло.

Адным з найбольш буйных загатоўшчыкаў зьяўляецца Белсадсаюз. На 15 верасьня плян загатовак выкананы на 44 проц. Але дагэтуль Белсадсаюз ня мае канкрэтных плянаў завозу гародніны. Есьць толькі агульны плян. Белсельпром загатовіў толькі 46 проц. яблык. Між іншым высьвятляецца рад нядбязак і недарэчнасьцяй у загатоўках гародніны паміж Белплодагароднінай, Белсадсаюзам і іншымі арганізацыямі. Для заводаў Белсельпраму ў Рэчыцы бульба завозіцца з Камарына, а з Рэчыцы бульба вывозіцца ў Гомель, што выклікае лішнія выдаткі.

Рэалізацыя гародніны пастаўлена дрэнна. Асартымэнт яе невыстарчальны — не хапае гуркоў, буракоў, цыбулі. У той-жа час, ёсьць шматлікія факты, калі базы ЦРК, ЗРК мэталістаў, фабрыкі «Кастрычнік» і іншыя адмаўляюцца прымаць патрэбную гародніну. У пасобных магазынах ЦРК псаваньне гародніны даходзіць да 8 і болып процантаў, замест 1,37 проц. 3-за нядбайнасьці ў гэтай справе зьняты з работы тры работнікі.

ЗРК фабрыкі «Кастрычнік» у забесьпячэньні рабочых гароднінай спадзяецца толькі на самацёк. Дагэтуль ЗРК не заключыў дагавору з саўгасам. Цукеркавая фабрыка «Камунарка» павінна па дагаворах прыняць ад калгасаў 90 тон яблык, а цяпер фабрыка чамусьці адмаўляецца прымаць гэтыя яблыкі. Менрайкалгасаюз абмяжоўваецца пры гэтым толькі складаньнем актаў. ЗРК заводу «Бальшавік» і кааперацыйныя крамы выдаюць бульбу ў лік зімовай нормы.

Хаваньне гародніны не ўнармаванае. На базе Белкаапсаюзу яна знаходзіцца ў дрэнным станавішчы. Памідоры ня мяюць месца ,гніюць, праз кожныя два дні робіцца пераборка і адпраўка на значныя пункты і часткова па перапрацоўку. Гародніна часта зваліваецца ў адну кучу. У той-жа час плошча базы рацыянальна не выкарыстоўваецца. У саўгасе «Забалоцьце» гароднінхавальня набудавана толькі на 50 проц.

Кааперацыя і загатоўчыя арганізацыі перажываюць напружанае становішча з тарай. Белпрамсаюз заключыў дагавор з Белсадсаюзам на настаўку да 1-га студзеня 1931 г. 55.000 бочак. Дагавор ня выконваецца. Гэта-ж самае адбываецца і па лініі Белтары. Не падрыхтавана тара і ў Белсельпраме. Бочкі з гатовай прадукцыяй, якія адпраўляюцца ў Белкаапсаюз, апошнім не зварочваюцца. У недахопе тары вінаваты ў значнай ступені самі кааперацыйныя і загатоўчыя арганізацыі, якія не прынялі энэргічных мер для мабілізацыі тары. МЦРК патрэбна 7.000 бочак, аднак, ён нічога не зрабіў для мабілізацыі бочак у насельніцтва.

Вузкім месцам зьяўляецца транспарт. Паводле дагавору Белсаўгастрэсту з Белплодагароднінай, усе прадукцыя саўгасаў здаецца на нарадах франко станцыя. Аднак, перавозачныя сродкі ядсутнічаюць. Замест 86 аўтамашын Белсаўгастрэст атрымаў адну. Перавозка наёмнымі падводамі абыходзіцца вельмі дорага. Фурманшчыкі бяруць за перавозку тоны на адлегласьці 28 клм. 46 руб. тады як тона буракоў і бруквы каштуе 46 руб. Заключаны МЦРК з гарсаветам дагавор на абслугоўваньне перавозак гародніны мясцовым транспартам, скасаваны гарсаветам. Уласны-ж транспарт ЦРК зусім невыстарчальны.

Перапрацоўка гародніны дагэтуль не разгорнута. Па МЦРК будаўніцтва квасільнага пункту ніяк ня скончана. Замест двух засолачных пунктаў пабудаваны адзін. Плян закваскі і засолкі ня выконваецца. Замест 400 тон памідораў засолена 130 тон. Гэта-ж самае і з капустай. Па Белсадсаюзе плян засолкі гуркоў выкананы на 42 проц. Не хапае перапрацоўчых пунктаў.

* *

Што трэба зрабіць для зьнішчэньня ўсіх гэтых недахопаў. Трэба безадкладна рэалізаваць пастанову прэзыдыуму Цэнтрасаюзу, які вызначыў канкрэтны плян работы для гародных гаспадарак.

Пастановай Цэнтрасаюзу прадугледжваецца безадкладнае прымацаваньне рабоплаў да раёнаў загатовак, а прыгарадных гародаў да прадпрыемстваў. Уборка бульбы і гародніны павінна быць скончана не пазьней 25-га КАСТРЫЧНІКА. Аплата працы асоб, якія прымаюць удзел ва ўборцы гародніны ў парадку грамадзкай ініцыятывы, павінна праводзіцца ГАРОДНІНАЙ. Усе рабочыя, занятыя ўборкай гародніны, павінны быць пераведзены на зьдзельную аплату працы.

Яшчэ адна перамога на камбінаце „Спартак"

ПУШЧАНА КАРАМЕЛЬНАЯ ФАБРЫКА

21 верасьня рабочыя камбінату «Спартак» (Гомель) сьвяткавалі вялікую перамогу — пуск новай карамельнай трохнавярховай фабрыкі.

Карамельная фабрыка будзе выпускаць праз кожныя 7 гадзін 10 тон прадукцыі, што пры трохзьменнай рабоце складае 30 тон, а ўсяго за год 10.350 тон. Фабрыка мэханізавана паводле апошняга слова тэхнікі. Трэба адзначыць, што ўсе мэханізмы заказваліся заводам СССР, што значна паскорыла пуск фабрыкі.

Сканчэньне пабудовы карамельнай фабрыкі ў тэрмін — гэта вялікі экзамэн, які з гонарам выкананы рабочым калектывам, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі.

ПЭРЭЛЬМАН.

Пастанова сакратарыяту ЦК КПБ(б)

АБ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНІ НАВУКОВЫМІ КАДРАМІ ВНУ І ВТНУ

Выкліканае вялізарнай патрэбай новых кадраў ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, разгортваньне сеткі ВНУ, ВТНУ і навукова-дасьледчых устаноў, стварыла ў гэтым годзе надзвычай напружанае становішча ў справе забесьпячэньня вышэйшых навучальных устаноў навуковымі працаўнікамі.

Для таго, каб забясьпечыць нармальную работу ўсіх ВНУ БССР, ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Ухваліць праведзенае культпропам ЦК плянавае разьмеркаваньне ўсіх камуністаў-навуковых працаўнікоў паміж асобнымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі і ВТНУ у Менску, а таксама праведзеную мабілізацыю раду навуковых работнікаў на работу ў ВНУ іншых цэнтраў БССР. Распаўсюдзіць практыку плянаванага разьмеркаваньня навуковых працаўнікоў на ўсе наўчэльныя навуковыя кадры, у тым ліку і на беспартыйных, і ўскладзі гэтыя задачы на Наркамасьветы, які праводзіць не сумесна з сэкцыяй навуковых працаўнікоў.

2. Адзначаючы, што з боку некаторых дырэктарыў ВНУ наглядаецца выпадкі зрыву плянавага разьмеркаваньня навуковых кадраў, факты перамяшваньня асобных навуковых працаўнікоў і г. д. ЦК КП(б)Б катэгарычна забараняе падобныя мэтады камплектаваньня, якія дэзарганізуюць усю работу забесьпячэньня навуковымі кадрамі ВНУ.

3. Культпропу ЦК забясьпечыць прыцягненьне да пэдагагічнай работы ў ВНУ асьпірантаў у аб'ёме, які-б не перашкаджаў іх навуковай падрыхтоўцы.

4. У мэтах хутчэйшай падрыхтоўкі новых навуковых кадраў, прапанаваць культпропу ЦК забясьпечыць прыцягненьне лепшых навуковых сіл і ў прыпатнасьці навуковых працаўнікоў-камуністаў для кіраўніцтва падрыхтоўкай асьпірантуры, у першую чаргу па гісторыі Беларусі, гісторыі КП(б)Б, беларускай літаратуры і г. д.

5. Адзначаючы наўпасьць аслабленьня ўвагі з боку навуковых працаўнікоў-камуністаў да работы ў ВНУ і асобныя факты адмаўленьня найбольш кваліфікаваных працаўнікоў-камуністаў ад пэдагагічнай работы ў ВНУ, ЦК паказвае ўсім навуковым працаўнікам камуністам на вялізарнае значэньне ўдзелу якаснага ўзроўню працы, рашаючага навышэньня аб'ёму ведаў, якія дае ВНУ, і неабходнасьць актыўнага і сыстэматычнага ўдзелу навуковых працаўнікоў-камуністаў у пэдагагічнай работы, у працы катэдраў, у барацьбе за ідэалёгічную вытрыманасьць выкладаньня ў партыйным і акадэмічным жыцьці ня ў партыйным і акадэмічным жыцьці ВНУ.

6. Зьвярнуць увагу бюро парт'ячэек ВНУ і ВТНУ, гарадзкіх і раённых камітэтаў партыі на неабходнасьць вызначэньня ўсіх навуковых працаўнікоў-камуністаў ад тых грамадзкіх нагрузак, схоластаў ад тых грамадзкіх нагрузак, ад кандыдатур і кампаній, дзе яны могуць быць заменены іншымі таварышамі. Дырэктарам ВНУ забясьпечыць, каб кожны навуковы працаўнік меў магчымасьць на працягу году, ня менш адчымасьць на працягу году, ня менш адного месяца (ня ўлічваючы чарговага водпуску) цалкам заняцца навукова-дасьледчай работай і павышэньнем сваёй кваліфікацыі.

7. ЦК прапануе дырэктарам ВНУ, ВТНУ і бюро парт'ячэек правесьці ў дэкады тэрмін рад мерапрыемстваў па рацыяналізацыі мэтадаў занятаў і скарыстаньні навуковых працаўнікоў (павялічэньне галзін самастойнай работы студэнтаў, больш сьмелае прыцягненьне да пэдагагічнага працэсу новых маладых сіл разгружаючы гэтым больш кваліфікаваныя кадры ад кансультацыі, прыёму заданьняў і г. д.).

8. Напружанае становішча з навуковымі кадрамі з усёй вострасьцю ставіць пытаньне аб правільным выкарыстаньні старых навуковых спэцыялістаў. Між тым, наглядаюцца асобныя факты недапушчальных адносін да беспартыйных навуковых працаўнікоў, якія супярэчаць дырэктывам партыі і ўказаньням, даным тав. Сталіным у апошняя прамове. Праводзячы і далей а яшчэ большай рашучасьцю і глыбінёй барацьбу за марксыцка-ленінскую мэтадалёгію ва ўсіх галінах навукі, ЦК паказвае на неабходнасьць правільных і чулых адносін да ўсіх тых навуковых працаўнікоў і спэцыялістаў, якія добрасумленна працуюць у інтарэсах сацыялістычнага будаўніцтва. Бязьлітасная і рашучая крытыка ўсякіх скажэньняў і адхіленьняў ад марксыцка-ленінскай тэорыі, якая павінна працягвацца і быць узьнята на больш высокі тэарэтычны ўзровень, ні ў якім выпадку не павінна ператварацца ў агульнае шальмаваньне, дробязныя прычэпкі і беспадстаўнае назбаўленьне магчымасьці далейшай навукова-пэдагагічнай работы і выпраўленьня сваіх памылак.

«Марксыцка-ленінская крытыка памылак навукова-тэхнічных работнікаў павінна выходзіць з таго, каб ня толькі не адштурхоўваць, а ўсё больш завабліваць на свой бок сапраўдных работнікаў навукі і тэхнікі. Неабходна захоўваць таварыскія формы ў гэтай крытыцы і ў адносінах да тых спэцыялістаў, якія пасьпяхова працуючы ў тэй ці іншай галіне, ня прышлі яшчэ да правільнага ўсьведамленьня марксыцка-ленінскага навуковага мэтаду» (Молатаў). ЦК паказвае на неабходнасьць сур'ёзнай пастаноўкі справы ўзбраеньня марксыцка-ленінскай мэтадалёгіяй і палітычнага выхаваньня беспартыйных навуковых працаўнікоў і зьвяртае ўвагу камуністаў-навуковых працаўнікоў на неабходнасьць іх актыўнага ўдзелу ў практычнай работе сэкцыі навуковых работнікаў, «ВАРНІТСО» і інш. арганізацый, якія павінны ажыцьцяніць гэту задачу.

9. ЦК прапануе Наркамасьветы забясьпечыць сыстэматычнае прасоўваньне на вышэйшыя навуковыя ступені (дацэнтуру і прафэсуру) тых навуковых працаўнікоў як беспартыйных, так і камуністаў, якія добра праявілі сябе на пэдагагічнай і навукова-дасьледчай работе.

10. ЦК прапануе сэкцыі навуковых працаўнікоў распрацаваць новыя формы аплаты навуковых працаўнікоў, выходзячы з таго, каб забясьпечыць ліквідацыю ўраўніўкі і замацаваньне навуковых кадраў за поўнымі вышэйшымі навуковымі ўстановамі. ЦК прапануе гарсаветам Менску, Гомелю, Віцебску і Магілеву і Горацкаму РВК прыняць адпаведныя захады для забясьпячэньня навуковых працаўнікоў і асьпірантаў жыльлёвай плошчай, абавязаўшы іх праз месяц дадаць аб выкананьні.

Канстатуючы, што ў БССР да гэтага часу фактычна не азьяцьцёўлены партыйныя дырэктывы і пастановы саюзнага ўраду аб забясьпячэньні навуковых працаўнікоў, ЦК абавязвае Наркамсаб і Белкаапсаюз у дэкады тэрмін забясьпечыць рэалізацыю вышэйпаказаных пастаноў. РСІ прасачыць за выкананьнем гэтай дырэктывы.

Праз месяц паставіць на сакратарыяце ЦК даклад камісіі садзейнасьці вучоным пры СНК БССР аб матар'яльным стаўленьні навуковых працаўнікоў і рабоце, праведзенай у гэтай галіне камісіяй.

Усебеларуская культпрапарада

Работу партшкол цесна ўвязаць з выкананьнем гаспадарча-палітычных задач

22-га верасьня закончыла работу Усебеларуская нарада культпропу РК і ГК КП(б)Б. На апошнім пасяджэньні нарады была заслухана інфармацыя тав. Платуна аб ходзе ўсенавучу і ўкамплектаваньня школ сацвыху настаўніцтвам.

У сваёй прамове тав. Платун, вызначаючы агульныя задачы народнай асьветы, даў падрабязную характарыстыку становішча на фронце ўсенавучу, ліквідацыі няпісьменнасьці і забесьпячэньні гэтага участку работы пэдагагічнымі кадрамі.

Побач з вялізарнейшымі дасягненьнямі БССР, якія атрыманы на аснове зажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі ў справе ўкараненьня пісьменнасьці ў гушчы рабочых, калгасных і бядняцка-сярэдняцкіх мас у радзе раёнаў у гэтай рабоце маюць месца прарывы. У выніку апартуністычных адносін да ўсеагульнага навучаньня в боку рабфакаў арганізацый і ўстаноў у Беткаўскім раёне яшчэ да гэтага часу ня ведаюць колькі ў іх няпісьменных і дзяцей школьнага ўзросту, у другіх раёнах шмат школ не пачалі яшчэ заняткаў.

У сувязі са шпаркім ростам школьнай сеткі у нас зараз адчуваецца значны недахоп настаўнікаў, асабліва па другім канцэнтры. Есьць выпадкі, калі ў выніку нядбайных адносін да справы з боку Райінспэктуры, у некаторых раёнах, ня гледзячы на тое, што іх заяўкі на настаўнікаў Наркамасьветы выканаў поўнасьцю, усё-ж не хапае пэдагагічных кадраў.

Скарыстаньне пэдагогаў, выключна па прызначэньні і добрая пастаноўка работы па забесьпячэньні настаўніцтва — важнейшыя ўмовы пасьпяховага ўкамплектаваньня настаўніцтвам нашых школ. Аб гэтым выразна сьведчаць факты з Чэрвеньскага раёну, дзе назіраецца вялікі прыток работнікаў асьветы. Аднак, гэтае палажэньне ўсьвядомлена яшчэ далёка не ва ўсіх раёнах.

У нашых школах павінна быць уведзена дыфэрэнцыяльная аплата працы настаўнікаў.

Тая блытаніна, якая мае месца ў нас па пытаньні мэтадаў работы школы і тыя школьныя «тэорыі і тэорыйкі» закол пытаньня аб вызначэньні месца і ролі працоўнай школы ў сацыялістычным будаўніцтве, патрабуюць узмацненьня барацьбы як з прадазапартыйнымі скажэньнямі, так і «лявацкімі» загібамі ў школьным будаўніцтве і ўзмацненьня мэтадычнага кіраўніцтва работай школ.

Апрача існуючых адзінак па Нарасьвеце, мы павінны ўвесьці ў раёнах ня менш, як па два інструктары — мэтадысты, па адным інспэктары дашкольных устаноў і кадраў.

Мы маем значныя прарывы ў галіне школьнага будаўніцтва, якія на аснове максымальнага выкарыстаньня ўнутраных рэсурсаў павінны быць ліквідаваны.

Пасьля інфармацыі тав. Платуна, нарада абгаварыла і зацьвердзіла праекты рэзалюцый, падрыхтаваных у сэкцыях. На аснове пастаноў ЦК КП(б)Б Культпрапарада ў сваіх пастановах вызначыла разгорнутую праграму работы культпропаў РК і ГК КП(б)Б у адпаведнасьці са спэцыялізацыяй і выдатнымі асаблівасьцямі пасобных раёнаў.

Адной з асноўных задач у галіне марксыцка-ленінскага выхаваньня зьяўляецца ператварэньне партыйных школ і гурткоў у баявыя брыгады змагароў за пасьпяховае выкананьне вытворчай праграмы сваіх прадпрыемстваў, саўгасаў, калгасаў і МТС і г. д.

— Пабудаваць сетку партасьветы, выходзячы з вытворчых умоў, прадпрыемства, калгасу і г. д. (цэх, брыгада, група, зьмена).

— Палажыць у аснову ўсёй практычнай работы школ пляны партмакетыраў, сельпарткомаў і ячэек, а таксама праграмы адпаведных вытворчых адзінак.

Увесьці абавязковае вывучэньне школ і асабліва кіраўнікоў іх з вытворча-бытавымі ўмовамі сваіх прадпрыемстваў; паставіць перад школамі задачу — авладаць тэхнікай поўнай галіны народнай гаспадаркі.

Вось умовы, якія павінны быць пакладзены ў аснову работы партасьветы.

Усебеларуская культпрапарада павінна стаць пераломным пунктам у сэнсе палепшэньня работы па разгортваньні марксыцка-ленінскага выхаваньня. Пастановы нарады, якія палкам асвоены на дырэктыве ЦК КП(б)Б, павінны быць шырока папулярызаваны сярод партыйных мас, рабочага і калгаснага актыву і поўнасьцю ажыцьцёўлены.

Манэўры часьцей РСЧА

ПЕРАД РАШАЮЧЫМ ЭТАПАМ

ЧЫРВОНЫЯ ПЕРАЙШЛІ Ў НАСТУПЛЕНЬНЕ

Байцы паказваюць прыклады баявой упартасьці, настойлівасьці гераізму

Узоры энтузіязму і самаадданасьці

РАЁН МАНЭЎРАЎ, 23-IX. (Спэцкор БелТА). 22 верасьня пачаліся баявыя дзельныя манэўруючых часьцей. Чырвоныя падыйшлі да ракі з трох пунктаў павялі рашучае наступленьне. З 7-ай гадзіны на працягу дня часьці чырвоных два разы фарсавалі рэчную агароджу, адціскаючы конніцу «сініх», якія перайшлі да мабільнай абароны. Стралковыя часьці чырвоных паказалі добрыя ўзоры самаадданасьці, энтузіязму, умелага скарыстаньня мясцовасьці і маскаваньня, што забясьпечыла ім магчымасьць нанесьці паражэньне «сінім». Задачы, якія былі пастаўлены перад наступаючымі, выкананы.

Кавалерыя «сініх», якая знаходзілася ў мабільнай абароне, паказала вялікую ўпартасьць і настойлівасьць.

На другім вучастку на працягу ўсяго дня «сінія» будавалі ўмацаваньні, рыхтуючыся да абароны.

На ноч войскам дан першынак. Набліжаецца рашаючы, найбольш складаны этап манэўраў, які патрабуе ад байцоў і начскладу надзвычайнага напружаньня сіл і энэргіі. Да гэтага этапу войскі падрыхтаваны.

На манэўрах. Пасьля адбою. Чырвонаармейцы пя лаяя ЦРК

Героі-ўдарнікі Новікаў і Бацэвіч

РАЁН МАНЭЎРАЎ, 23-IX. (СПЭЦКОР БЕЛТА). У ЧАСЕ ФАРСАВАНЬНЯ РАКІ САПЕРЫ №-СКАГА ПАЛКА ПАКАЗАЛІ САПРАЎДНЫ ГЕРАІЗМ. ДЛЯ ГАГО, КАБ ПЕРАКІНУЦЬ ШТУРМАВЫ МОСЬБІК, ПАТРЭБНА БЫЛО РАНЕЙ ЗА ЎСЁ ПРАЦЯГНУЦЬ ПРАЗ РАКУ КАНАТ. ПАВЕТРА ХАЛОДНАЕ. СЬПЛЕ ГУСТЫ ДОЖДЖ. ТРЭБА ПЕРАПЛЫСЬЦІ РЭЧКУ З КАНАТАМ. ДОБРААХВОТНА НА ГЭТА ВЫКЛІКАЮЦЦА ЎДАРНІКІ БРАЦЭВІЧ І НОВІКАЎ. ЯНЫ ЗЬНЯЛІ З СЯБЕ ВОПРАТКУ, ГОЛЫЯ КІНУЛІСЯ Ў ВАДУ І ХУТКА ПЕРАЦЯГНУЛІ КАНАТ. МОСЬБІК БЫЎ ПЕРАКІНУТ У МОМАНТ. ЧАСЬЦЬ ПЕРАПРАВІЛАСЯ СВАЛЯЧАСОВА. ЗАДАЧА ВЫКАНАНА. АБ ГЕРОЯХ МАНЭЎРАЎ ПАВІННА ВЕДАЦЬ УСЯ БССР.

Растуць калёны ўдарнікаў „Імя манэўраў"

— БАЙЦЫ І КАМАНДНЫ СКЛАД №-СКАЙ КУЛЬРОТЫ АБВЯСЬЦІЛІ СЯБЕ ЎДАРНІКАМІ «ІМЯ МАНЭЎРАЎ». ЗАКЛЮЧАНЫ САЦДАГАВАРЫ ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ І ГРУПАВЫЯ. У ЧАСЕ ПЕРШАГА МАРШУ НЯ БЫЛО НІВОДНАГА АДСТАВАНЬНЯ. ПРЫЗВАЛЫ СКАРЫСТАНЫ ДЛЯ ЧЫТКІ ЛІСТОВАК І ГАЗЭТ.

— У СУВЯЗІ З МАНЭЎРАМІ №-СКАЯ БАТАРЭЯ АБВЯСЬЦІЛА СЯБЕ ЎДАРНАЙ «ІМЯ МАНЭЎРАЎ». БАЙЦЫ НА ЎСЕ 100 ПРОЦ. ЎСТУПІЛІ Ў КАЛГАСЫ.

— У №-СКІМ СТРАЛКОВЫМ ПАЛКУ ПАДАНА ЗАЯЎ У ПАРТЫЮ — 34, У КАМСАМОЛ — 33. У АДНЫМ З ПАЛКОЎ З 14 БАЙЦОЎ, ВЫЗВАЛЕНЫХ САНІТАРНАЙ КАМІСІЯЙ, 8 ПАДАЛІ ЗАЯВЫ АБ ДАЗВОЛЕ ІСЬЦІ НА МАНЭЎРЫ.

— УДЗЕЛЬНІКІ АБ'ЯДНАНАГА ПАРТЫЙНА - КАМСАМОЛЬСКАГА СХОДУ №-СКАГА СТРАЛКОВАГА ПАЛКА АБВЯСЬЦІЛІ СЯБЕ ЎДАРНІКАМІ «ІМЯ МАНЭЎРАЎ».

ЦК КП(б)Б, ЦВК І СНК БССР, КАЛГАСЦЭНТРУ, „ЗЬВЯЗЬДЗЕ" І „САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ"

Па ініцыятыве газэты „Савецкая Беларусь на манэўрах" у раёне манэўраў часьцей РСЧА саўгасы і калгасы разгарнулі кампанію па выдзяленьні жарабят і коняй для Чырвонай арміі, называючы іх „коньмі абароны".

Кампанія па выдзяленьні „коняй абароны", дзякуючы сацспаборніцтву, ахапляе новыя калгасы і саўгасы. Працягваем работу.

Рэдакцыя газэты „Савецкая Беларусь на манэўрах"— Шастакоў.

МАНЭЎРЫ ВЫКЛІКАЛІ ПРЫЛІЎ Ў КАЛГАСЫ

РАЁН МАНЭЎРАЎ, 22. (Спэцкор БелТА). Калгасы і сельсаветы №-скага раёну выкарыстоўваюць манэўры для датаравіновага выкананьня палітычна-гаспадарчых кампаній. Калгасьнікі па-ўдарнаму ўзяліся за ўборку ільну. Зараз уборка ўжо скончана. Ударныя мэтады працы ўжыты пры пасеве азімых. Пасьляхова выконваюцца пляны загатовак. За апошнія дні чырвоныя абозамі здана дзяржаве каля 32 тон збожжа, шмат бульбы і гародніны.

У вёсцы А. арганізаваўся калгас з 76 бядняцка-сярэдняцкіх гаспадарак, у вёсцы Б. — з 14 гаспадарак.

Сацдагавары калгасаў з кавалерыстамі

РАЁН МАНЭЎРАЎ, 23. (БЕЛТА). Манэўруючыя часьці заключаюць сацыялістычныя дагавары з калгасамі на лепшае правядзеньне манэўраў з аднаго боку і на поўнае выкананьне асеньніх с.-г. кампаній—з другога.

У часе астаноўкі пасьля маршу начсклад і чырвонаармейцы №-скага кавалерыйскага палка заключылі дагавор з адным з калгасаў, ля якога байцы спыніліся на начоўку. Калгасьнікі ўзялі на сябе абавязкі—да канца манэўраў перавесьці ўсю работу ў калгасе на зьдзельшчыну, на працягу двох бліжэйшых дзён скончыць уборку яравых з тым, каб усе працаздольныя выйшлі на ўборку бульбы і гародных культур; да Кастрычніцкіх сьвят выканаць усе загатоўкі; поўнасьцю ліквідаваць абязьлічку і г. д. Байцы №-скага кавалерыйскага палка абавязаліся без адзінага дысцыплінарнага ўчынку, бераржліва адносіцца да тэхнічнага ўзбраеньня і конскага складу.

На сходзе арганізавана ячэйка Асоавіяхіму, у якую ўступілі ўсе калгасьнікі. На другі дзень, пасьля заключэньня сацдагавору, калі байцы выступілі ў паход, калгасьнікі арганізавалі чырвоны абоз са збожжам.

У другім калгасе гэтаму-ж палку быў перадан чырвоны сьцяг і наказ. У наказе калгасьнікі пісалі: „Правядзеце ўзорна манэўры. Мы ганарымся нашай Чырвонай арміяй і яе баявой вывучкай". На заклік калгасьнікаў кавалерысты адказалі гатоўнасьцю па-ўдарнаму правесьці манэўры, паказаць узор дысцыплінаванасьці і палітычнай сьвядомасьці.

9.000 рабочых—Данбасу

Праўленьне калгасу „Серп і Молат" запалохвае адыходнікаў

Старшыня Усоцкага сельсавету Заазка не выдае адыходнікам дакумантаў,

ЗРЫЎШЧЫКАЎ ВЯРБОЎКІ РАБСІЛЫ ДЛЯ ДАНБАСУ ПРЫЦЯГВАЦЬ ДА СУДОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ!

ШКЛОЎ. ШКЛОЎСКАМУ РАЁНУ ДА НА ЗАДАНЬНЕ НАКІРАВАЦЬ У ДАНБАС 150 РАБОЧЫХ. ГЭТАЯ КОЛЬКАСЬЦЬ ЛЮДЗЕЙ ЗАВЯРБАВАНА, АЛЕ ПАСЛАНА ЗНАЧНА МЕНШ. НА 20 ВЕРАСЬНЯ БЫЛО АДПРАЎЛЕНА Ў ДАНБАС 68 ЧАЛАВЕК, З ІХ 63 КАЛГАСЬНІКАЎ І 5 АДНААСОБНІКАЎ, У ТЫМ ЛІКУ 9 КАМСАМОЛЬЦАЎ. 21-ГА ПАВІННА БЫЛО ВЫЕХАЦЬ КАЛЯ 100 ЧАЛАВЕК, АЛЕ АДПРАЎЛЕНА ТОЛЬКІ 32. ПРЫЧЫНА: НЕВЫСТАРЧАЛЬНАЯ РАСТЛУМАЧАЛЬНАЯ РАБОТА СЯРОД ЗАВЕРБАВАНЫХ КАЛГАСЬНІКАЎ.

* *

НАРОЎЛЯ. АДПРАЎКА РАБСІЛЫ ДАНБАС ІДЗЕ СЛАБА. ПРЫ ЗАДАНЬНІ Ў 250 ЧАЛАВЕК, АДПРАЎЛЕНА ДА 20 ВЕРАСЬНЯ 73 РАБОЧЫХ. НЕКАТОРЫЯ СЕЛЬСАВЕТЫ НЕ ДАПАМАГАЮЦЬ У ГЭТАЙ СПРАВЕ (БАРБАРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ). ПРАЎЛЕНЬНЕ КАЛГАСУ «СЕРП І МОЛАТ» ЗАПАЛОХВАЕ АДЫХОДНІКАЎ І З 9 РАБОЧЫХ, ЯКІЯ ЗГАДЗІЛІСЯ ПАЕХАЦЬ У ДАНБАС, ПАЕХАЛІ ТОЛЬКІ ДВА.

* *

КЛІЧАЎ. РАЁН ЗАМЕСТ 200 ЧАЛАВЕК НАКІРАВАЎ У ДАНБАС ТОЛЬКІ 67. АРГАНІЗАВАНА КАМІСІЯ САДЗЕЙНАСЬЦІ ІМЯ ДАНЕЦКАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ. 17 ВЕРАСЬНЯ АДБЫЎСЯ ЗЬЛЁТ КАЛГАСЬНІКАЎ-АДЫХОДНІКАЎ. РАЙПРАФСАВЕТ ПАСЛАЎ ВРЫГАДЫ ВЯРБОЎШЧЫКАЎ ПА СЕЛЬСАВЕТАХ, ПАДРЫХТАВАНА ДА АДПРАЎКІ 100 РАБОЧЫХ. АДНАК, АДПРАЎКА МОЖА БЫЦЬ САРВАНА, БО НЕКАТОРЫЯ СЕЛЬСКІЯ І КАЛГАСНЫЯ РАБОТНІКІ АДМАЎЛЯЮЦЬ АДЫХОДНІКАМ У ВЫДАЧЫ ДАКУМАНТАЎ (СТАРШЫНЯ УСОЦКАГА СЕЛЬСАВЕТУ ЗАЗЕКА, ПРАЎЛЕНЬНЕ КАЛГАСУ «ВОЛЬНАЯ ПРАЦА»).

* *

МСЬЦІСЛАЎЛЬ (РАЁН, ЯКІ ЗАНЕСЕН «ЗЬВЯЗДОЙ» НА ЧОРНУЮ ДОШКУ). ВЯРБОЎКА РАБОЧЫХ ДЛЯ ДАНБАСУ ПРАХОДЗІЦЬ МАРУДНА. РАЁННЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ АБЯЦАЮЦЬ ВЫКАНАЦЬ ЗАДАНЬНЕ, АЛЕ НІЧОГА НЯ РОБЯЦЬ. РАЁН ПАВІНЕН ДАЦЬ ДАНБАСУ 200 РАБОЧЫХ. УСЯГО АДПРАЎЛЕНА 37 ЧАЛАВЕК. 13 ЧАЛ. ПАВІЧНЫ БЫЛІ ВЫЕХАЦЬ 21 ВЕРАСЬНЯ. РАЙКОМ КАМСАМОЛУ ДАЎ АБЯЦАНЬНЕ ПАСЛАЦЬ 75 КАМСАМОЛЬЦАЎ. ГЭТА АБЯЦАНЬНЕ ПАВІННА БЫЦЬ ВЫКАНАНА.

* *

ТАЛОЧЫНА (РАЁН, ЯКІ ЗАНЕСЕН «ЗЬВЯЗДОЙ» НА ЧОРНУЮ ДОШКУ). РАЁН МАЕ ЗАДАНЬНЕ ДАЦЬ ДАНБАСУ 200 РАБОЧЫХ. НА 20 ВЕРАСЬНЯ БЫЛО АДПРАЎЛЕНА Ў ДАНБАС 32. УЧОРА МЫ АТРЫМАЛІ ТЭЛЕГРАМУ АД РАЙКОМУ КП(б)Б АБ ТЫМ, ШТО ДЛЯ ДАНБАСУ ЗАВЕРБАВАНА 180 ГАРНЯКОЎ, З ІХ АДПРАЎЛЕНА У ДАНБАС 100. ВЯРБОЎКА

ЭПАР ПланСкан А2В

Ніводнага цэнтнэра збожжа прыватніку

КАЛГАС „ЭНЭРГІЯ“ ПРЫНЯЎ ВЫКЛІК „ЛЕНІНСКАГА ШЛЯХУ“

ДА 25-га ВЕРАСЬНЯ „ЭНЭРГІЯ“ АБАВЯЗАЛАСЯ ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ ЗАДАНЬНЕ ПА ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКАХ

Выклік прымаем!

ТАЛАЧЫН.

У адказ на адозву калгасу «ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ» аб датэрміновым выкананьні і перавыкананьні плянаў загатовак, унесеньні плацяжоў і гаспадарчым замацаваньні калгасаў («Зьвязда» ад 17 верасьня), калгасьнікі КАЛГАСУ «ЭНЭРГІЯ», Пераволацкага сельсавету, абавязаліся сябе ўдарнымі і мабілізаванымі на пасьпяховае правядзеньне ўсіх гэтых кампаній.

«Мы лічэ больш згуртуемся вакол камуністычнай партыі на выкананьне і перавыкананьне ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній» — гаворыцца ў рэзалюцыі агульнага сходу калгасу «Энэргія». «НА 18 ВЕРАСЬНЯ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК НАШЫМ КАЛГАСАМ ВЫКАНАН НА 50 ПРОЦ. Абавязваемся да 25 верасьня выканаць плян збожжазагатовак НА ЎСЕ 100 ПРОЦ. Плян сэнэзагатовак выканан намі на 100 проц.

Улічваючы вострую патрэбу нашай прамысловасьці ў сырцы, мы здаем 19 верасьня дзяржаве 160 кгр. добраякаснага апрацаванага ільну і да 1-га лістапада абавязаемся скончыць поўнасьцю апрацоўку і здаць дзяржаве пён з 12 га.

Свалчасова скончыўшы пасеў азімых, пераключаемся на правядзеньне зяблевага ворыва, якое скончым поўнасьцю да 1-га кастрычніка.

З 20 верасьня пачынаем капаць бульбу. Абавязваемся свалчасова і поўнасьцю ўбраць бульбу і выканаць плян бульбазагатовак да вызначанага тэрміну.

Датэрміноваа ўносячы ўсе плацяжы (сельгаспадатак, страхоўку, самаабкладаньне), падпісваемся ДАДАТКОВА на пазыку «Трэці рашаючы» на 300 руб. Да 1-га кастрычніка поўнасьцю ліквідуем запазычанасьць па ўзносах за пазычу.

Мы выклікаем пасьледаваць нашаму прыкладу ўсе калгасы Талачынскага раёну».

К.

Прызыўнікі арганізуюць масавыя чырвоныя абозы

ТАЛАЧЫН.

ЗА ЧАС ПРЫЗЫВУ Ў РСЧА ПА РАЁНЕ АРГАНІЗАВАНЫ МАСАВЫЯ ЧЫРВОНЫЯ АБОЗЫ КАЛГАСЬНІКАЎ І АДНААСОБНІКАЎ ПА ЗДАЧЫ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ. ПРЫЗЫЎНІКІ ЕЛАХОЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ ЗДАЛІ 8.000 КГР. ЗБОЖЖА, ДРУЦКАГА—7.300 КГР., НЯХЛЮДАЎСКАГА—6.400 КГР., ПЛЮСКАГА—5.000 КГР., КРУГЛЯНСКАГА — 3.500 КГР. І Г. Д. УСЯГО ПРЫЗЫЎНІКАМІ ЗДАНА ДЗЯРЖАВЕ 51.525 КГР. ЗБОЖЖА. ПАСТУПЛЕНЬНЕ ЗБОЖЖА ЧЫРВОНЫМІ АБОЗАМІ ПРАЦЯГВАЕЦЦА.

УЛ. ВАНЦЭВІЧ.

Брагінскія апартуністы зрываюць збожжазагатоўкі

БРАГІНА.

Апошнія даныя аб ходзе збожжазагатовак па БРАГІНСКІМ раёне сыгналізуюць лічную пагрозу зрыву гэтай кампаніі. Гадавы плян загатовак выканан толькі на 8,1 проц.

Асноўная прычына гэтага ганебнага прарыву — апартуністычная недзеяздольнасьць арганізацый. РАЙКАЛГАССАЮЗ доўгі час адмаўляўся прыняць вызначаны яму плян загатовак, сьцьвярджаючы, што апошні зьяўляецца нерэальным. Калгассаюз склаў свой «контрплян», паводле якога калгасы павінны... АТРЫМАЦЬ ад дзяржавы столькі збожжа, колькі ім вызначана здаць у парадку загатовак.

Апартуністычныя «плянаваньні» райкалгассаюзу цалкам разьбіты праведзеный фактычнай праверкай урадажаю. Аднак, гэта прывяло да таго, што плян загатовак быў спушчан у сельсаветы і калгасы са спазьненьнем амаль на цэлы месяц.

Партыйныя і камсамольскія арганізацыі вёскі ня былі свалчасова мабілізаваны на правядзеньне шырокай масава-растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў закон збожжазагатовак. Кіраўнікі некаторых калгасаў імкнуцца ігнараваць збожжазагатоўкі. Так, старшыня калгасу ў САВІЦКІМ сельсавеце САКОЎСКІ на сходзе калгасьнікаў заявіў: «Наш калгас ня можа здаць ні аднаго фунта збожжа». Такія-ж настрої нагнядаюцца ў калгасе «ДОБРАХВОТНІК». І гэта ў той час, калі ў «Добраахвотніку» ў гэтым годзе вельмі добры ўраджай (10 цэнтнэраў вуса з 1 гэкт.).

Вясковы актыў ня быў ўцягнут у падрыхтоўку да збожжазагатовак. Камісіі садзейнасьці не працуюць, а ў радзе месц гэтых камісій яшчэ зусім няма. У некаторых сельсаветах камісіі садзейнасьці выпучаліся габінэтным парадкам прозьдымамі сельсаветаў без удзелу мас.

Сельскія ўпаўнаважаныя выпучаны толькі ў 9 сельсаветах замест 14, прычым склад упаўнаважаных падабраны зусім няўважліва. Сярод іх ёсьць асобы, якія ня раз былі пад судом (КРАЎЧАНКА і інш.) і якія пітаральна бязьдзейнічаюць.

Цьвёрдыя заданьні купацка-заможным гаспадаркам вызначаны толькі тыдзень назад. Кантроль за выкананьнем гэтых заданьняў не наладжан.

Партыйная арганізацыя Брагіншчыны павінна зараз-жа па-баявому ўключыцца ў збожжазагатоўчую кампанію і мабілізаваць сябе на поўнае выкананьне вызначанага пляну. Прарывы павінны быць неадкладна ліквідаваны. Шляхам шырокага разгортваньня масава-растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў, арганізацыі сацспаборніцтва калгасаў і грамадзкага буксіру ў аднаасобным сэктары трэба дабіцца, каб да 1-га кастрычніка раён даў ня менш 50 проц. гадавога заданьня.

Д. ГІЛОДЗІ, ПІВУНОЎ.

Аршанчыка выканала верасьнёўскі плян

ВОРША. (Наш кар.).

АРШАНСКІ РАЁН ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЎ ВЕРАСЬНЁЎСКІ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАТОВАК — У 900 ТОН. 20 ВЕРАСЬНЯ ДА АРШАНСКАГА ЭЛЕВАТАРА БРЫБЫЛО ШМАТ ЧЫРВОНЫХ АБОЗАЎ, АРГАНІЗАВАНЫХ КАЛГАСЬНІКАМІ І АДНААСОБНІКАМІ. УСЯГО ПРЫБЫЛА КАЛЯ 2.000 ФУРМАНАК. ЗА ГЭТЫ ДЗЕНЬ ЗДАНА ДЗЯРЖАВЕ ЗВЫШ 200 ТОН ЗБОЖЖА.

КАЛГАСЬНІКІ І АДНААСОБНІКІ ЗАПЭЎНІЛІ ПАРТЫЮ І ЎРАД, ШТО ЯНЫ МАБІЛІЗУЮЦЬ УСЕ СІЛЫ НА ПОЎНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ЗАДАНЬНЯЎ ПА ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКАХ.

КУСТАНОВІЧ.

АПАЛ—ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ І РАБОЧЫМ ЦЭНТРАМ

Арганізаваць бесьперабойную падачу вагонаў

За 23 дні верасьня Менск атрымаў толькі 1000 вагонаў дроў

Узмацніць тэмпы па адгрузцы дроў пралетарскім цэнтрам БССР

Адгрузка дроў пралетарскім цэнтрам праходзіць нездавальняюча. Штодзённыя тэлеграмы, якія атрымлівае «Зьвязда», сьведчаць аб тым, што чыгунка, ня гледзячы на шматлікія сыгналы друку і неаднаразовыя дырэктывы партыі, ня ўжывае рашучых захадаў да бесьперабойнай падачы вагонаў-паражняку пад адгрузку дроў. На сённішні дзень на чыгуначных станцыях сабраліся вялізарныя запасы дроў, якія павінны быць безадкладна адгружаны буйнейшым прамысловым гарадом БССР.

Толькі для аднаго Менску на чыгунках заведены для адгрузкі 1.600 вагонаў дроў. На Пасталоўскай вузка-калейнай чыгунцы ляжаць запасы дроў на 1.000 вагонаў, адгрузка якіх затрымліваецца па віне шырока-калейнай чыгункі.

У рэзультаце дрэннай адгрузкі, Гомель забясьпечан дровамі на 50 проц. Бабруйск таксама — на 50 проц., Ворша — на 30 проц., Віцебск — на 25 проц., Барысаў — на 25 проц. і Магілеў — на 30 проц. Дзеяць сталоўак Магілеву працуюць з вялікімі перабоямі толькі выключна з-за адсутнасьці неабходнай колькасьці апалу.

На лепш стаіць справа і з забясьпячэньнем дровамі гор. Менску. За 23 дні верасьня ў Менск прыбыло ў лік разьвёрсткі ЦК КП(б)Б і СНК БССР усяго 1.000 вагонаў. За верасень Менск павінен атрымаць 4.500 вагонаў.

Раёны, на якія ўскладзена персональная адказнасьць за адгрузку дроў для Менску, недаацэньваюць усёй палітычнай важнасьці гэтай работы і не забясьпечылі бесьперабойнай адпраўкі дроў у Менск. Старобінскі і Пятрыкоўскі раёны не даюць ніякіх паведамленьняў аб ходзе работы па адгрузцы дроў.

Лесбел значнае адносіцца да справы забясьпячэньня апалам пралетарскіх цэнтраў. Калі Лесэзбыт зьвярнуўся у Лесбел з просьбай аб замацаваньні 1.000 коняй з Лесбелаўскага транспарту для вывазкі дроў, дык апошні, спасылаючыся на рад аб'ектыўных прычын, ня хоча даць гэтай колькасьці коняй. Пакуль што дана распараджаньне на замацаваньне за Лесэзбытам 330 коняй.

Па прапанове Лесэзбыту, гарпрафсавет згадзіўся вызначыць рабочых з Менскіх прадпрыемстваў для таго, каб устанавіць кантроль за ходам работы па вывазцы. Але Лесбел у асобе тав. ПАРЫЖА катэгарычна адмовіўся ад прыёму гэтых людзей.

— На ліха нам нейкія там кантролі, — заявіў у адказ тав. Парыж.

Неабходна адзначыць, што работа па разгрузцы прыбываючых вагонаў з дровамі пастаўлена зусім дрэнна. Чыгунка, якая адказвае за адгрузку, па некалькі дзён ня выгружае прыбыўшых вагонаў. 22-га верасьня ў Менск прыбыло 31 вагон дроў, якія сталі неразгружанымі ЦЭЛЫЯ СУТКІ. Гэтым тлумачыцца той факт, што 23-га верасьня адгрузка дроў Менску была сарвана.

Лесэзбыт, прымаючы пад увагу недапушчальна павольныя тэмпы работы чыгункі ў справе падачы вагонаў, зьвярнуўся па гэтым пытаньні да дырэктара Зах. чыгункі з просьбай забясьпечыць максымальную падачу вагонаў пад адгрузку апалу.

Дырэктар даў загад Гомельскаму і Жлобінскаму чыгуначным вузлам, каб апошнія штодзённа звыш тых вагонаў, якія складаюць «вяртушку» па адгрузцы дроў, давалі яшчэ дадаткова 40 вагонаў. З 1-га кастрычніка гэтыя вузлы павінны даваць штодзённа пад адгрузку дроў па 80 вагонаў.

Гэта ставіць баявую задачу перад Гомельскай і Жлобінскай партыйнымі арганізацыямі і ў першую чаргу перад чыгуначнікамі прасачыць за поўным выкананьнем распараджэньня дырэктара Зах. чыгункі.

Толькі пры бесьперабойнай падачы вагонаў, пралетарскія цэнтры будуць забясьпечаны апалам.

Брыгада газэты «Зьвязда» на дровазагатоўках. У авапе—дзесятнік т. ДОЎБНР

АРШАНСКІ РАЙПРАФСАЧ МАБІЛІЗАВАЎ 203 ЧЫГУНАЧНІКАЎ НА ДРОВАЗАГАТОЎКІ

Для таго, каб забясьпечыць рабочых і служачых чыгункі апалам, другі пленум Белбюро ЦК чыгуначнікаў даў дырэктыву пазавым чыгуначным арганізацыям распачаць самазагатоўкі дроў.

18 верасьня Белбюро ЦК чыгуначнікаў заслухала даклад Аршанскага і Віцебскага райпрафсачаў па выкананьні выкананьня імі гэтай дырэктывы.

Толькі адзін Аршанскі райпрафсач па-баявому прыступіў да рэалізацыі пастановы Белбюро ЦК чыгуначнікаў, атрымаў лесасеку і мабілізаваў 203 чалавека-чыгуначнікаў на дровазагатоўкі.

Віцебскі райпрафсач ніякіх захадаў у гэтым напрамку ня ўжыў. На пэсяджэньні райпрафсачу была заслухана інфармацыя начальніка матар'яльнай службы раёну аб становішчы з апалам па раёне і вынесена пастанова аб тым, што 15.000 кубаметраў, якія ўжо загатоўлены з патрэбных 18.000 кубаметраў для чыгункі, хопіць для забясьпячэньня рабочых. Віцебскі райпрафсач забыўся аб тым, што гэтыя дровы загатоўлены для паравозаў.

Выходзячы з гэтага, прэзыдыум Белбюро ЦК чыгуначнікаў прапанаваў усім райпрафсачам безадкладна дагаварыцца на месцах з лесазагатоўчымі арганізацыямі, атрымаць лесасекі і мабілізаваць рабочыя брыгады для самазагатовак дроў.

Райпрафсачы, якія па той ці іншай прычыне ня змогуць атрымаць лесасекаў, павінны безадкладна тэлеграфаваць у Белбюро ЦК чыгуначнікаў, якое прыме адпаведныя захады.

Прапанавана райпрафсачам, каб апошнія далі загад усім МК лінейных станцый, прыняць захады да збору ўсякіх драўнініных адкідаў, гальля, торфу і г. д. у паласе адчужэньня для апалу квартэр рабочых.

Белбюро ЦК чыгуначнікаў зьвяртае ўвагу ўсіх асоб, якія маюць дачыненьне да апалу і электраэнэргіі захоўваць эканомію апошніх.

Адказасьць па кіраўніцтве гэтай работай па ўсіх раёнах БССР ускладзена на члена прэзыдыуму Белбюро ЦК чыгуначнікаў тав. Вожыка.

РАХУНАК ЧЫГУНЦЫ

Дровы чакаюць вагонаў

КЛІЧАЎ. (Па тэлеграфу). На 20 верасьня Клічаўскі раён загатовіў 6.908 кбм. дроў. Падвезена да чыгуначнай стацыі 4.344 кбм. У лік 400 вагонаў дроў, якія павінен адгрузіць раён Менску, адгружана 61 вагон. Бесьперабойная адгрузка дроў затрымліваецца непадачай вагонаў чыгункай.

Чапёлкін.

***

БАБРУЙСК. (Па тэлеграфу). За верасень Бабруйскі лесапрамгас павінен адгрузіць для Менску 500 вагонаў дроў. На 18 верасьня адгружана ўсяго 195 вагонаў. Падрыхтавана яшчэ 50 вагонаў, адгрузка якіх затрымліваецца з прычыны непадачы вагонаў чыгункай.

***

ПАРЫЧЫ. (Па тэлеграфу). На 15-га верасьня Парыцкі раён адгрузіў Менску 115 вагонаў дроў, з якіх 16 —сплавам. Падвезена да чыгункі 84 вагоны, адгрузка якіх затрымліваецца дрэннай падачай вагонаў.

Райкампарт Райвыканком ЖУРАЎЛЁЎ. ДАШКО.

***

УБОРКІ. (Па тэлеграфу). 21-га верасьня было запатрабавана пад адгрузку дроў Менску 15 вагонаў. Чыгунка не дала ніводнага.

Мурач.

***

СТАРУШКІ. (Па тэлеграфу). Для адгрузкі дроў Менску кожны дзень патрэбна 35 вагонаў. Чыгунка вагонаў не дае.

Пасталаўскі.

***

ЖЫТКАВІЧЫ. (Па тэлеграфу). На станцыі Жыткавічы падрыхтавана да адгрузкі Менску 100 вагонаў дроў. Свалчасовая адгрузка дроў зрываецца непадачай вагонаў.

Бойтман.

***

КАЛІНКАВІЧЫ. (Па тэлеграфу). 22-га верасьня з Ніхову адгружана ў Менск 5 вагонаў дроў.

Казачук.

СЛУЦКІ ЛЕСПРАМГАС

выканаў гадавы плян вывазкі дроў на 97,7 проц.

СЛУЦАК. (Наш кар.).

Слуцкі леспрамгас гадавое заданьне па загатоўках дроў выканаў на 59,3 проц. Вывезена 53.728 кубамэтраў, што складае 97,7 проц. гадавога пляну.

Прарыў па ДРОВАЗАГАТОЎКАХ тлумачыцца дрэннай работай лесрабкопу. Лесарубы уходзяць з лесараспрацоўчых вучасткаў, бо лесрабкоп не выдае харчаваньне, у крамах лесрабкопу адсутнічаюць прамтавары і прадукты першай неабходнасьці.

Райвыканком і іншыя раённыя арганізацыі ня кіруюць кампаніяй дровазагатовак. Работа леспрамгасу нікім не правяраецца.

Я. ЖЫЛКА.

МАБІЛІЗАЦЫЯ СРОДКАЎ

ПАЧЫНАЕЦЦА МАСАВАЯ ПРАВЕРКА

АФАРМЛЕНЬНЯ ПАДПІСКІ НА ПАЗЫКУ Ў ГОРАДЗЕ І НА ВЁСЦЫ

ДАБІЦЦА ЛІКВІДАЦЫІ РАЗРЫВУ ПАМІЖ РЭАЛІЗАЦЫЯЙ І АФАРМЛЕНЬНЕМ

АДОЗВА

да ўсіх камісій садзейнасьці, ячэек ЛКСМБ, чырвонасьцажнага настаўніцтва і членаў саюзу фінбаннаўскіх работнікаў

У выніку вялікага ашуканьству працоўных мас і шырокага разгортваньня масавай работы, мы маем па БССР вялікія посьпехі ў справе рэалізацыі пазыкі. Рабочыя гораду перавысілі плянавае заданьне. Калгасны сэктар таксама наблізіцца да поўнага выкананьня пляну.

Але агульныя колькасныя паказальнікі рэалізацыі пазыкі ўсё яшчэ невыстарчальныя; мы маем усе магчымасьці іх перавысіць.

Падпіскай на пазыку яшчэ не ахоплена каля 10-15 проц. рабочых і служачых і 40-45 проц. калгасьнікаў. Пропант-жа выкананьня плянавага заданьня па аднаасобным сэктары зусім недавальняючы — 25 проц.

Зараз мы ўступілі ў адказьнейшы перыяд кампаніі — афармленьня падпіскі, якая з-за невыстарчальнай увагі з боку фінансава-крэдытнага апарату і камісій садзейнасьці праходзіць нездавальняюча. Па груце рабочых і служачых афармлена падпіска на 77 проц., а па калгасным сэктары на 30 проц.

Цяперашні перыяд кампаніі патрабуе напружанай работы і увагі з боку ўсёй савецкай грамадзкасьці. Мы абавязаны выкарыстаць усе магчымасьці для перавыкананьня ўсіх плянавых заданьняў па падпіоцы на пазыку і афармленьні на пад лёзунгамі: «Ніводнага працоўнага без абліґацыі трэцяга рашаючага», «Ніводнага рубля на падпіоцы, які не афармлен узносам!».

Камсамольцы, чырвонасьцяжнае настаўніцтва, фінансава-банкаўскія працаўнікі, члены камісій садзейнасьці! Ад вашай штодзённай упартай работы залежыць выкананьне і перавыкананьне плянавых заданьняў па рэалізацыі пазыкі, афармленьні падпіскі, налажэньні ашчаднай справы і паогул выкананьні фінансавага пляну. Вы павінны дамагчы выканаць гэтыя задачы сваім аксёрным ударам і непасрэдным прыкладам.

Цэнтральная камісія садзейнасьці пры ЦВК БССР, ЦК ЛКСМБ, ЦП саюзаў працаўнікоў і фінбаннаўскіх устаноў і Наркамфін БССР абвяшчаюць на 25-га верасьня г. г. масавы пахід за рэалізацыю пазыкі ў вёсцы і за поўнае афармленьне праведзенай падпіскі як у горадзе, так і на вёсцы.

Паход павінен стаць шырокай палітычна-масавай кампаніяй, ён павінен мабілізаваць вакол рэалізацыі і афармленьня падпіскі шырокую грамадзкасьць. Асабліваю ролю ў арганізацыі гэтага паходу павінны адыграць камісіі садзейнасьці, камсамольскія ячэйкі, настаўніцтва і фінансава-банкаўскія работнікі.

Камісіі садзейнасьці дзяржкрэдыту і ашчаднай опекі! На вас урадам ускладзена адказнейшая задача — рэалізаваць пазыку на вёсцы. Згрупуйце ахвяў вакол гэтай кампаніі, расстаўце сілы так, каб поўнасьцю абслужыць усе пункты і забясьпечыць рэалізацыю і афармленьне падпіскі. Арганізуйце кадры грамадзкіх інструктароў, бярэце ахвотчых на грамадзкі буксір, выдзяляйце і прэміруйце лепшых актывістаў, якія праявілі сябе ў рэалізацыі пазыкі і ашчаднай справе. Устанавеце неасабісты кантроль за паступлеьнем грошай па падпіцы і прасоўваньнем гэтых сродкаў да крэдытных устаноў. Арганізуйце шырокае абслугоўваньне пазыкатрымальнікаў!

Камсамольцы! Вы, якія паказалі бальшавіцкія прыклады работы ў выкананьні дырэктыў партыі на важнейшых участках сацыялістычнага будаўніцтва, павінны паказаць узорную працу і ў рэалізацыі пазыкі на вёсцы. Праверце выкананьне дырэктывы ЦК УсеЛКСМ аб тым, што «кожны камсамолец павінен завербаваць ня менш 6 падпісчыкаў на пазыку «Трэці рашаючы».

Чырвонасьцяжнае настаўніцтва, ударнікі культурнага фронту!

Вы павінны прыняць актыўны ўдзел у рэалізацыі і афармленьні пазыкі на вёсцы. Вы павінны дапамагчы вясковым арганізацыям сваім актыўным удзелам і прыкладам правесьці шырокую растлумачальную работу аб пазыцы сярод калгасьнікаў і аднаасобнага бядняцка-серадняцкага сялянства. Зрабеце школы, хаты-чытальні, клюбы і іншыя культурна-асьветныя установы цэнтрам штодзённай агітацыйна-растлумачальнай работы аб дзяржкрэдыце і ашчаднай справе, забясьпечце ўкараненьне ў шырокія працоўныя масы ідэі дзяржкрэдыту. Тым самым будзе забясьпечана выкананьне і перавыкананьне плянавых заданьняў па рэалізацыі пазыкі.

Працаўнікі фінансава-крэдытнага апарату! Ад вас залежыць свалчасовае, дакладнае і поўнае афармленьне падпіскі і забясьпячэньне паступленьня ўзносаў. Устанавеце сапраўдны кантроль рублём за выкананьнем плянавых заданьняў, арганізуйце лепшае абслугоўваньне пазыкатрымальнікаў, забясьпечце свалчасова ўсе арганізацыі агітацыйна-справачным і аперацыйным матар'ялам, арганізуйце практычную дапамогу сельсаветам, камісіям садзейнасьці і калгасам у пастаноўцы ўліку, паразку афармленьня падпіскі і паступленьня ўзносаў. Арганізуйце жывы інструктаж і дапамогу ніваўным арганізацыям у афармленьні падпіскі і рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнікаў!

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, пры актыўным удзеле ўсёй савецкай грамадзкасьці, шляхам разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, рашучым адпорам кулацкай агітацыі і ўдарам па апартуністычнай недаацэнцы пазыкі, выкананем і перавыкананем заданьне па рэалізацыі пазыкі да вёсны і забясьпечым поўнае афармленьне падпіскі.

Цэнтральная камісія садзейнасьці дзяржкрэдыту і ашчаднай справе пры ЦВК БССР.
Цэнтральны Камітэт ЛКСМБ.
ЦП саюзу працаўнікоў асьветы.
ЦП саюзу фінансава-банкаўскіх работнікаў.
Наркамфін БССР.

Фінплан павінен быць выканан*)

Тэмпы мабілізацыі сродкаў насельніцтва ў 3-м квартале яўна нездавальняючыя. Раённыя, партыйныя, савецкія і прафэсыянальныя арганізацыі не забясьпечылі сапраўды ўдарных тэмпаў у рабоце па мабілізацыі сродкаў.

Першая дэкада верасьня дала амаль столькі-ж, колькі і апошняя дэкада жніўня. Гэта значыць, што калі трэцяя дэкада жніўня дала рост наступленьня сродкаў на паўтара мільёна супроць другой дэкады жніўня, дык першая дэкада верасьня ніякага росту не дала.

За апошні час заўважаецца некаторая абязьлічка ў паступленьні плацяжоў, імкненьне за кошт некаторых плацяжоў (с.-г. падатак) пакрыць бязьдзейнасьць па іншых, ня менш важных. Так, пры росьце паступленьня с.г. падаткаў за першую дэкаду верасьня на 25,3 проц. квартальнага пляну па радзе плацяжоў, асабліва добраахвотных, мы маем недапушчальна мізэрнае нарастаньне тэмпаў. Па пазыцы трэцяга рашаючага году прырост за дэкаду складае ўсяго толькі 6 проц., па укладах ашчадкасы 0,7 проц., па акцыях Трактарацэнтру—3 проц., па паёх у спажывецкую каапэрацыю—7 проц.

Першыя дзьве дэкады верасьня паказалі, што рад раёнаў па-баявому мабілізавалі грамадзкасьць, рабочых і калгасныя масы на выкананьне дырэктывы партыі аб 100-процантным выкананьні фінансавага пляну. Зіроцінскі раён да тэрміну перавыканаў плян мабілізацыі сродкаў, Наблізаюцца да выкананьня пляну Гомельскі, Менскі, Аршанскі, Магілеўскі, Любаньскі і іншыя раёны.

Побач з гэтым, як і раней, ганебна плятуцца ў хвасьце Дубровенскі раён —27 проц., Чырвонапольскі—39 проц. Бешанковіцкі—40 проц., Расонскі — 35,3 проц. Практыка работы перадавых гарадоў і раёнаў паказвае поўную рэальнасьць плянаў, магчымасьць свалчасовага іх выкананьня. Адставаньне некаторых раёнаў зьяўляецца простым вынікам дрэннай арганізацыі фінансавай работы, адсоўваньня яе на задні плян, няўменьне ўвязаць яе з вырашэньнем чарговых гаспадарча-палітычных кампаній.

Да поўнага выкананьня пляну нам не хапае каля 20 мільёнаў рублёў. Гэтыя 20 млн. рублёў патрэбны для скан'чэньня капітальнага будаўніцтва ў прамысловасьці, для сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і забясьпячэньня сацыяльна-культурных мерапрыемстваў.

Задача мясцовых партыйных і грамадзкіх арганізацый, усёй фінансава-крэдытнай сыстэмы заключаецца ў тым, каб па-баявому перабудаваць сваю работу і забясьпечыць бязумоўнае выкананьне фінансавага пляну рашаючага году пяцігодкі.

Неабходна мабілізаваць усю грамадзкасьць гораду і вёскі, рашуча змагаючыся з кулаком і яго агентурай, да біцца 100-процантнага выкананьня заданьня.

Раёны, якія адстаюць, павінны пераняць узоры работы Сіроцінскага раёну, які здолеў да тэрміну перавыканаць данае яму заданьне па мабілізацыі сродкаў. Перадавыя раёны павінны ўзяць на грамадзкі буксір адстаючыя.

Дэкада, якая засталася да канца кварталу, павінна стаць пэрыядам рэзкага нарастаньня тэмпаў фінансавай работы, пэрыядам разгорнутай бальшавіцкай барацьбы за выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў.

А.

*) У сувязі з тым, што ў часе вёрсткі перабытан артыкул «Фінплян павінен быць выканан», надрукаваны ў «Зьвязьдзе» ад 23-IX, артыкул зьмешчаны другі раз.

На пленуме ЦП саюзу мяса-рыбнікаў

Чаму сьвіня важыць на 30 кгр. менш нормы?

ТАМУ, ШТО ПРЫЁМАЧНЫЯ БАЗЫ БЕЛМЯСА ПРАЦУЮЦЬ ДРЭННА

Белмяса і Белрыба—буйныя гаспадарчыя арганізацыі, на якія ЦК КП(б)Б усклаў рад адказьнейшых задач па забясьпячэньні пралетарскіх цэнтраў.

Ці выканалі гэтыя арганізацыі свае задачы?

На пленуме ЦП саюзу мяса-рыбнікаў выявіліся вялікія недахопы ў рабоце Белмяса і Белрыбы, якія ня выканалі важнейшых якасных і часткова колькасных паказальнікаў прамфінпляну 1931 году.

Белмяса выканала плян убою па буйной рагатай жывёле на 129 проц., па авечках—на 350 проц., па сьвіньнях—на 11 проц. Характэрны іншыя лічбы. Выпрацоўка на аднаго рабочага ў дзень складае 11,4 галавы буйной рагатай жывёлы замест 15 па пляне, ці 76 проц. Па каўбасной вытворчасьці выпрацоўка на аднаго рабочага дасягае 68 кгр., замест 80 кгр. па пляне, або 85 проц. Выхад мяса ад буйной рагатай жывёлы выражаецца ў 96,2 кгр. супроць запраектаваных 116,1 кгр.—недабор на 17,14 кгр., па сьвіньнях гэты недабор складае 29,49 кгр., па авечках—26,1 кгр. Якасьць каўбасных вырабаў часта не адпавядае патрабаваньням рабочага спажыўца.

Такім чынам мясная прамысловасьць Беларусі ня выконвае раду сур'ёзных якасных паказальнікаў. На пленуме ЦП мяса-рыбнікаў прадстаўнік Белмяса прабаваў у асноўным усклаўсці віну за прарыў на аб'ектыўныя прычыны, нібы «плян—нерэальны». У спрочках высьвятлілася, што справа не ў нерэальнасьці пляну, а ў агіднай арганізацыі працы ва многіх зьвеньнях Белмяса і на радзе прадпрыемстваў. Даволі сказаць, што прамова тав. Сталіна дагэтуль яшчэ ня ўсюды нават прапрацавана, работа не перабудавана. Ні ў аб'яднаньні, ні на прадпрыемствах якасныя паказальнікі ня ўключаны ў прамфінплян. Ніякі выхад мяса тлумачыцца ў значнай ступені нявыразнай работай прыёмачных баз Белмяса. Намечаная рэканструкцыя 4 мясных камбінатаў і пабудова 3 жывёлапрыгонных пунктаў ня выканана.

На гаспадарчы разрахунак мясныя камбінаты перайшлі фармальна. Дагаворы на загатоўку жывёлы і здачу мяса не заключаны. Справаздачнасьць адстае. Па Аршанскім камбінаце, напрыклад, няма яшчэ балянсу на 1 студзеня 1931 году. І толькі ў выніку праведзеннага пад націскам прафарганізацый ударнага месячніка да 6 прадпрыемстваў балянсы былі складзены.

Пераглядзеў тарыфнага справачніка і ўвядзеньне прагрэсыўна-прэміяльнай зьдзельшчыны сустракае супраціўленьне з боку кіраўніцтва Белмяса. Створаная пры аб'яднаньні цэнтральная камісія нават не прыступіла да работы і фактычна развалілася. Між тым ураўнілаўка на прадпрыемствах мясной прамысловасьці трымаецца яшчэ даволі моцна. На Гомельскім мясным камбінаце чорнарабочы заробле столькі-ж колькі майстар каўбаснай фабрыкі. Толькі на Менскай бойні ўдалося пераглядзець тарыфны справачнік і дабіцца падзяленьня працы і ліквідацыі ўраўнілаўкі. Загон жывёлы для убою раней рабілі майстры і падмайстры, а цяпер чорнарабочыя. Тое-ж самае і па зьбёмцы тлушчу. Да ўвядзеньня прагрэсыўна-прэміяльнай зьдзельшчыны ў быкабойным цаху забівалі ў дзень 90 галоў, працавалі звышгэрмінова. Цяпер за 7 гадзін забіваюць 230-240 галоў, а заробак павялічыўся з 3 руб.—да 7-8 руб. у дзень.

Сумны малюнак прадстаўляе работа Белрыбы і Белрыбаксаюзу. Гадавы плян улову рыбы выканан усяго на 51 проц. Уся работа рыбных вучасткаў праходзіць самацёкам, без кантролю і дапамогі. Забясьпячэньне рыбакоў пастаўлена дрэнна. У Воршы, Мазыры і Бабруйску матавыя фонды для рыбакоў пераданы на іншыя затаўкі. Многія райкалгассавы ігнаруюць дырэктывы партыі і ўраду і перакідаюць рыбакоў на іншыя работы, як гэта мела месца у Асьвеі, Тураве і Лепелі.

У Беларусі прудавы фонд займае 20.000 гэкт. Аднак, прадукцыя высокаякаснай рыбы не адгрымае яшчэ адпаведнай ролі ў рабочым завесьпячэньні. З-за пэрыядычнай загібелі пасадачнага матар'ялу (гаспадарка «Чырвоная зорка») зрываўся выхад таварнай прадукцыі. У 1931 г. у эксплёатацыю павінен быў увайсьці рад новых прудавых гаспадарак. Але будаўніцтва іх праходзіць вельмі марудна. Плян выканан усяго на 60 проц., а па капітальным рамонце—на 30 проц. Значная частка раённых арганізацый, у тым ліку і прафсаюзных, недаацэньвае значэньня прудавых гаспадарак і не аказвае ім патрэбнай дапамогі. Між Белрыбай і Белрыбаксаюзам пастаянныя спрэчкі. Апарат гэтых арганізацый не перабудаваўся.

Выключэньнем зьяўляецца Белпушкапрадукт, які паказаў на радзе вучасткаў сапраўды ўдарныя тэмпы работы. Па загатоўках птушкі плян выканан на 138 проц., яец—на 59 проц. гадавога пляну, пераапрацоўцы яец—на 105 проц. Кожнае прадпрыемства мае прамфінплян. На Менскім камбінаце гаспадарчы разрахунак праведзен амаль поўнасьцю. Закончан перагляд тарыфнага справачніка. З 1-га кастрычніка на ўсіх камбінатах уводзіцца прагрэсыўна-прэміяльная зьдзельшчына. Новыя нормы і пераход на зьдзельшчыну павінны даць павышэньне прадукцыйнасьці працы на 17 проц. Ня добра стаіць справа са зьніжэньнем сабекошту. Гэты паказальнік ня выканан.

Пленум ЦП шмат увагі аддаў перабудове прафработы. У выніку праведзенага месячніка дасягнут некаторых зрух. На радзе прадпрыемстваў—Менскім мясакамбінаце, Віцебскім маслабойным заводзе, лечна-птушным камбінаце ў Полацку выбраны цэхавыя камітэты, прафупаўнаважаныя, групоргі. Вядзецца работа з асобнымі групамі рабочых і вядучымі прафэсыямі, павялічыўся прафактыў. Саюзныя арганізацыі прынялі актыўны ўдзел у арганізацыі пры радзе прадпрыемстваў сьвінавадкормацыйных пунктаў, сталовак і г. д.

Усё-ж у прафработе маюцца яшчэ і сур'ёзныя прабелы. На 11 прадпрыемствах мясарыбнай прамысловасьці ўдарніцтвам ахоплена ўсяго 60 проц. рабочых. Уліку выстарчальнага кіраўніцтва сацспаборніцтвам няма. На Аршанскім мясакамбінаце з 700 рабочых членаў саюзу 260. Культмасавая работа перабудоўваецца слаба. На прадпрыемствах адсутнічаюць адзіныя культплянны.

Пленум ЦП саюзу мяса-рыбнікаў Беларусі пастанавіў выклікаць і заслухоўць сакдагавор з Заходнім абласным камітэтам саюзу. У працэсе сакдагавору ЦП прыняло на сябе рад абавязацельстваў па практычнай рэалізацыі ў мясарыбнай прамысловась

Год выдання—XV
№ 260 (4465)
Чацвер, 24 верасьня 1931
Цана нумара 5 кап.
выходзіць
БЕСЫПЕРАШЧНА

Зьвязда

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, СВЕРДЛОВА, 63.
Тэлефоны
рэдактар—5-27, сакратар—12-74, партсэктар—13-80, прамысл.—13-60, сял. гасп.—6-19, мясц. інфарм.—6-19, замеж. інфарм.—6-48, навны рэдактар—6-12, нарадная інфармацыя—10-71, канцтавары—8, аддзел абвестак—7-34.

„ДАПАМАЖЭЦЕ!“

—НЯСЕЦЦА ВОКЛІЧ З ЗАСЬЦЕНКАЎ ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

„МЫ З ВАМІ“

—АДКАЗВАЕ ЎСЯ КРАІНА БУДАЎНІКОЎ САЦЫЯЛІЗМУ

Сёньня пяты дзень усеагульнай галадоўкі у польскіх турмах

„Мы горача вітаем гераічную барацьбу 10.000 зьняволеных братоў“

(Рэзалюцыя мітынгу рабочых чырвонасьцяжнага заводу імя Варашылава).

Заслухаўшы інфармацыю тав. Рак-Міхайлоўскага аб фашысцкім наступленьні на правы палітзьняволеных і аб усеагульнай галадоўцы 10.000 лепшых барацьбітоў пралетарскай рэвалюцыі, закінутых у лёхі белапольскіх турмаў, агульна-заводзкі мітынг рабочых, ІТР і служачых чырвона-сьцяжнага машына-будаўнічага заводу імя Варашылава канстатуе:

Рыхтуючыся да вайны, польскі фашызм узяў сабе за мэту задушыць рэвалюцыйны рух шляхам фізычнага зьнішчэньня яго авангарду — кампартыі.

З гэтай мэтай уведзен у турмах новы драконаўскі рэгляамант, а «на волі» —ваенна-палявыя суды.

Але ні карныя экспэдыцыі, ні сотні гадоў катаргі ня спыняць магутнага рэвалюцыйнага ўздыму рабоча-сялянскіх мас, а наадварот, паглыбляюць яго і гартуюць. Рэвалюцыйная хваля з кожным днём нарастае. Стыхійныя выступленьні пад уплывам загартаванай у полымі клясавых баёў КПП набываюць формы арганізаванай барацьбы супроць дыктатуры фашызму.

Сьвядомасьць хуткай пагібелі прыводзіць у шаленства фашысцкіх катаў. Фашызм узьняў сваю крывавую лапу помсты над жыцьцём 10.000 рэвалюцыянэраў-палоньнікаў.

Гераічная барацьба палітзьняволеных супроць фашысцкага наступленьня набыла цяпер форму магутнай усеагульнай галадоўкі.

10.000 зьняволеных братоў узьняліся на салідарную барацьбу. Фронт гэтай барацьбы — фронт барацьбы з польскім фашызмам. Гераічная барацьба палітзьняволеных — справа кожнага рабочага і селяніна. Перамога палітзьняволеных — перамога ўсяго рэвалюцыйнага руху. Ідзе барацьба не на жыцьцё, а на сьмерць. Адбываецца крывавы цядзьнак палітзьняволеных з азьвярэлым фашызмам.

З прытоеным дыханьнем наглядаючы за ходам усеагульнай галадоўкі, мы горача вітаем гераічную барацьбу зьняволеных братоў.

Фашысцкае наступленьне на жыцьцё рэвалюцыянэраў-палоньнікаў разабудзіла аб маналітны фронт пралетарскай рэвалюцыі ў Польшчы і ва ўсім сьвеце.

Мы кляймім ганьбай польскіх фашыстаў, якія зьдзекуюцца над безабаронными палоньнікамі і дамагаемся спыніць крывавыя расправы над нашымі братамі.

Рукі прэч ад палітзьняволеных!

Дарагія таварышы, зьняволеныя браты!

Мы добра вадаем, што нашы дасягненьні сьвяўяюцца і вашымі дасягненьнямі. Мы добра ведаем, што нашы перамогі зьяўляюцца таксама і вашымі перамогамі і што гэтыя перамогі набліжаюць ваш Кастрычнік і ваша вызваленьне.

Вось чаму мы яшчэ больш прыкладзем сваіх сіл і здольнасьцяй на выкананьне нашых баявых плянаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі, і мы добра ведаем, што гэтыя пляны выканаем і перавыканаем.

Разумеючы, што МОПР зьяўляецца арганізацыяй салідарнасьці і дапамогі палітзьняволеным капіталу і іх сем'ям, мы ўсе як адзін уступаем у рады гэтай арганізацыі і даручаем заўкому зараз-жа правесьці збор сродкаў у дапамогу 10.000 палітзьняволеных, якія пакутуюць у турмах белапанскай Польшчы.

Мы зварачаемся да рабочых мэталістаў Нямеччыны: выступайце з пратестам супроць зьдзекаў над нашымі братамі па барацьбе. У будучых рашаючых баёх мы, браты па клясе, будзем разам і, разам змагаючыся, мы прыдзем да перамогі.

Няхай жыве і мацнее Камінтэрн — штаб сусьветнай рэвалюцыі!

Няхай жыве і мацнее ЎсеКП(б) і яе ЦК, пад кіраўніцтвам якога пралетарыят СССР пераможна будуе сацыялізм!

Няхай жывуць і мацнеюць КПП, КПЗБ і КПЗУ — правадыры і арганізатары вялікай барацьбы за Савецкую Польшчу!

Сьмяротны прыгавор ці апраўданьне

ВАЕННА-ПАЛЯВЫЯ СУДЫ У ВЭНГРЫІ

ВЕНА, ... Згодна паведамленьняў з Будапэшту, вэнгерская паліцыя вялізнымі плякатамі, расклеенымі на ўсіх перакрыжаваньнях, даводзіць да ведама насельніцтва аб увядзеньні палявых судоў у Вэнгрыі. Абвяшчэньне гэта падкрэсьлівае, што палявыя суды ўводзяцца ў першую чаргу супроць удзельнікаў камуністычнага руху і спатчаючых яму. На падставе закону аб палавых судох, любы судовы разгляд справы можа закончыцца або сьмяротным прыгаворам, або апраўданьнем абвінавачаных. Сьмяротны прыгавор выключае магчымасьць абскарджаньня яго і пасьля 2-х гадзін па прачытаньні павінен быць выканан.

Паралельна з афіцыяльным увядзеньнем палявых судоў, у радзе вёсак фактычна абвешчан стан аблогі. Вёскі пакінуты войскамі і жандармэрыяй. Тэлефонная сувязь паміж правінцыяй і Будапэштам перарвана. У Будапэшце ходзяць чуткі аб сялянскіх паўстаньнях і сутычках сялян з урадавай уладай. Фашысцкія атрады, мабілізаваўшы ўсе свае сілы, вядуць па ўсёй краіне паромную антысэміцкую агітацыю. Яўрэйскі друк указвае на тое, што ўрад падтрымлівае паромны рух. Вэнгерская сацыял-дэмакратычная партыя ўступіла ў адкрытае паразуменьне з урадам. Сацыял-дэмакратычны орган «Пенсава» друкуе заяву, у якой гаворыцца, што «сацыял-дэмакратычная партыя адмаўляе ўсякія ваўтоўныя мэтады зьмены рэжыму і стаіць на пункце гледжаньня паступовага разьвіцьця». Камуністычная партыя Вэнгрыі пашырае пракляматы, у якіх выкрывае ільжывасьць паліцэйскіх абвінавачаньняў камуністаў у арганізацыі замаху на цягнік і абвяшчае, што адказам на абвостраны ўрадавы тэрор будзе абвостраная клясавая барацьба.

Коратка

— У Рэйнскай вобласьці забаронена камуністычная газэта «Рур Эхо» за надрукаваньне адозвы Цэнтральнага Камітэту камуністычнай партыі да ангельскіх маракоў. Цяпер ужо забаронены амаль усе камуністычныя газэты Нямеччыны.

— Мільярд марак складае сума савецкіх заказаў нямецкай прамысловасьці. Дзьвесьце тысяч рабочых заняты на выкананьні гэтых заказаў («Ротэ Фанэ»).

— Пры бамбардаваньні мукдэнскага арсэналу японскімі войскамі забіта 300 рабочых. Японскім часьцям, якія захапілі арсэнал, дасталося на 100 млн. даляраў зброі і амуніцыі.

— Калгасы Закаўказьзя 20 верасьня датэрмінова выканалі гадавы плян збораж жазагатовак, здаўшы дзяржаве 1.131.527 пудоў збожжа-прадуктаў.

— Надыходзячы чацьверты квартал абвешчан ударным трохмесячнікам эканоміі апалу. Лёзунгам трохмесячніка будзе: «З'эканоміць ня менш 2 з пал. —З мільёнаў тон апалу».

Японская інтэрвэнцыя ў Кітаі пашыраецца

ПАТОК ЯПОНСКІХ ВОЙСК

ШАНХАЙ, 23. Наперакор тагійскім абвяржэньням, што больш войска у Манчжурыю не пасылаецца, кітайскі друк сьцьвярджае, што японскія войскі ўсё прыбываюць у Манчжурыю. У цяперашні час у партох Ян Цзы-Цьзянь знаходзіцца 14 японскіх ваенных карабляў. Нанкінскі ўрад катэгарычна абвяргае паведамленьне аб непасрэдных перагаворах у Японіі, указваючы, што пытаньне пастаўлена перад радай Лігі Нацый.

Акупанты захапляюць усё новыя гарады

ТОКІЁ, 23. Агэнцтва Сімбун Рэнго паведамляе з Чанчуня, што пасьля заняцьця японскімі войскамі сёньня ў 11 гадзін 30 мінут Чан-цзэуня, частка войск накіравана далей на Таонан, другая ў Тунляо. Частка войск, заняўшая Гірын, сёньня пасьля поўдня заняла Дуньхуа. Адначасова ваенны міністар аддаў загад затрымаць адпраўку ваяводаў другой свабодной дывізіі ў Цзяндао. Пастаноўлена ў выпадку неабходнасьці адправіць у Цзяндао паліцэйскія атрады.

НОВЫЯ РУЙНУЮЧЫЯ ЎДАРЫ СУСЬВЕТНАГА ЭКАНАМІЧНАГА КРЫЗІСУ

ШАЛЕНЫМ ТЭМПАМ падае АНГЕЛЬСКІ ФУНТ

У Сіці паніка

ЛЁНДАН, 23. Закрыцьцё біржы ўнесла ХВАЛЯВАНЬНЕ І РАССТРОЙСТВА У ДЗЕЛАВОЕ ЖЫЦЬЦЁ. У СІЦІ—ПАНІКА. Вечарам рада біржы абвясьціла аб сваёй пастанове адкрыць біржу сёньня раніцой. Сёньня узбуджэньне крыху прыціхла, аднак, ЗЬДЗЕЛКІ НА БІРЖЫ АМАЛЬ НЕ ЗАКЛЮЧАЮЦЦА.

На ангельскія вэксалі няма пакупцоў

БЭРЛІН, 22. Паводле паведамленьня з Амстэрдаму, сёньня была зроблена спроба адкрыць біржу ў Амстэрдаме. КАТЫРОЎКІ ВЫЯВІЛІ КАТАСТРАФІЧНАЕ ПАДАНЬНЕ АНГЕЛЬСКАГА ФУНТА. Фунт стэрлінгаў ацэньваўся ў 10½ галяндзкіх гульдэнаў супроць 12,03 на 20 верасьня. Ангельскія каштоўныя паперы і вэксалі ЗУСІМ НЕ ЗНАХОДЗЯЦЬ ПАКУПЦОЎ, так што зусім нельга было ўстанавіць ніякага курсу.

На амстэрдамскай біржы сёньня панавалі такі ПАНІЧНЫ НАСТРОЙ, як у ліпені, калі пачаўся ФІНАНСАВЫ КРЫЗІС У НЯМЕЧЧЫНЕ.

Згодна паведамленьняў з Парыжу ФРАНЦУСКІЯ БАНКІ АДМАЎЛЯЛІСЯ СЁНЬНЯ АБМЕНЬВАЦЬ АНГЕЛЬСКІЯ ФУНТЫ, у французкіх магазынах і гасьцініцах менялі фунт з разьліку 100 ФРАНКАЎ ЗА ФУНТ У ТОЙ ЧАС, КАЛІ ПАРЫТЭТ СКЛАДАЕ 126 ФРАНКАЎ. У Лёндане сёньня фунт катываваўся 4,16 даляра, што азначае паданьне на 15% параўнальна з запатым парытэтам.

16 шылінгаў замест 20

ЛЁНДАН, 23. Учора фунт стэрлінгаў катываваўся ў Нью-Ёрку па 17 шылінгаў і два пенсы, у Парыжы—па 16 шылінгаў, у Жэнэве—па 16,5 шылінгаў і ў Бэрліне і Брукселі па 17 шылінгаў (фунт—20 шылінгаў). Аб ступені паданьня фунта можна меркаваць па тым, што золата на ўчарашны дзень павысілася ў цане амаль на 15 шылінгаў на унц і дасягнула самага высокага ўзроўню за час з 1921 году. Цана на пшаніцу паднялася на 12 проц., а на бавоўну — па 7 процантаў.

Фунт і ліра

РЫМ, 22. Новае паданьне фунта выклікала тут сур'ёзьнейшы непакой. Баючыся біржавой панікі, урад забараніў газэтам друкаваць весткі аб уплыве курсу фунта на італьянскую эканоміку і фінансы, па італьянскую ліру (ліра — італьянская манэта).

Дзьверы біржы зачынены

ГЕЛЬСІНГФОРС, 22. У сувязі з фінансавым крызісам у Англіі, нарада ў міністэрстве фінансаў прыняла пастанову аб спыненьні катыроўкі чужаземнай валюты. Закрыта гельсінгфорская фондавая біржа.

Штурм прарываў у выкананьні прамфінпляну

Рабочыя мэханічнага заводу імя Варашылава абвясьцілі, у сувязі з манэўрамі, штурм прарываў у выкананьні прамфінпляну. Выбран штаб кіраўніцтва вытворчымі манэўрамі. Заключан дагавор на сацпаборніцтва з падшэфнай райсковай часьцю.

У адзнаку манэўраў 8 лепшых ударнікаў падалі заявы ў партыю.

РЭДАКЦЫЯ „ЗЬВЯЗДЫ“ І ЦКК-РСІ

оклікаюць

НАРАДУ

—) ПА ПЫТАНЬНЯХ (—

Барацьбы з эпізоатыямі і ўвядзеньня зоавэтмінімуму ў жывёлагадоўчых гаспадарках.

НАРАДА АДБУДЗЕЦЦА СЁНЬНЯ, у 7 гадзін вечара, у памяшканьні РЭДАКЦЫІ: Савецкая, 63, 3-ці паверх, сельска-гаспадарчы сэктар.

На нараду запрашаюцца прадстаўнікі Наркамзему т. т. Сьмірноў і Грузакоў, Белкалгасцэнтру—Красоўскі, Аўчыньнікаў. Сьвіняводу—Аўчыньнікаў, Гарыленка. Валасецкі, ВЭТ'у—Аўчыньнікаў і Пісараў, Белсельгасабъяднаньня Белкаапсаюзу—Вайцаховіч і Сердзялевіч, Белмяса—Безбародаў, Васкабовіч.

Быць мастацкім цэхам ПЯЦІГОДКІ

ДА ПАЧАТКУ РАБОТЫ БДТ-1 У МЕНСКУ

«Ісьці ў нагу з пралетарыятам пад яго кіраўніцтвам і кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі — гэта ёсьць генэральная задача калектыву БДТ-1», — так фармуляваў задачы БДТ-1 урад БССР у грамаце, выданай да дзесяцігадовага юбілею тэатру.

У ліпені мінулага году на ўсесаюзнай алімпіядзе мастацтваў БДТ-1 паказаў свой мастацка-ідэалёгічны твар, які характарызаваўся «востра-актуальнай тэматыкай і вялікa-мастацкай культурай».

На падставе вялікіх посьпехаў выкананьня пяцігодкі, на падставе бурных тэмпаў культурнай рэвалюцыі, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, тэатр здолеў перамагчы нацыянал-дэмакратычныя тэндэнцыі, якія панавалі ў яго мінулай рабоце. Нацыянал-дэмакраты імкнуліся працягнуць праз «Кастуся» і «Нёман» буржуазна-кулацкую ідэалёгію, каб ёю атруціць сьвядомасьць шырокіх працоўных мас. Перамагаючы гэтыя варожыя пралетарыяту, тэатр цьвёрда становіцца на шлях сацыялістычнай тэматыкі вырашаючы яе «адпаведна нацыянальным умовам», і гэтым самым становіцца актыўным будаўніком культуры, пралетарскай па зьмесьце і нацыянальнай па форме.

Адначасова ў тэатры разгортваецца пасьпяховая барацьба супроць індывідуалістычнага псыхалёгізму, які праяўляецца ва ўпадніцкіх настроях дэклясуючых, антыпралетарскіх і клясава-чужых элемэнтаў («Міжбур'е»). Выцісканючы варожую або «нэйтральную» тэматыку, цэнтральнай фігурай рэпэртуару становіцца «Гута» з яе ўстаноўкаю на адлюстраваньне барацьбы рабочых мас за гэнэральную лінію партыі, за індустрыялізацыю нашай краіны і рацыяналізацыю вытворчасьці. Вакол «Гуты» групуюцца не спаборнікі: «Ярасьць», «Лінія агню», «Міжбур'е», цалкам наближаючы тэатральнае мастацтва да шырокіх працоўных мас.

Сцэна з «Гуты»

Але якраз цяпер, уступіўшы ў другое дзесяцігодзьдзе свайго існаваньня, БДТ-1 становіцца перад адказьнейшай задачай стварэньня мэтаду сваёй творчасьці, мэтаду паказу нашай гераічнай часьці, такога мэтаду, які-б грунсучаснасьці, такога мэтаду, які-б грунсучаснасьці, такога мэтаду, які-б грунтаваўся на сьветапогляде рабочае клясы, на дыялектычным матэрыялізьме.

Тэатр зараз вырашае адказьнейшую задачу па вытворчай рэканструкцыі, і пасьпяховае не выкананьне зможа вывесьці яго на шлях сапраўднага пралетарскага мастацтва. Пралетарскі тэатр павінен быць тэатрам рабочае клясы і ва ўсёй сваёй рабоце адбіваць яе сьветапогляд.

Для таго, каб цалкам замацаваць на гэтых пазыцыях, каб стаць мастацкім цэхам пяцігодкі, БДТ-1 павінен быць акружан увагай рабочай грамадзкасьці і стаць аб'ектам жорсткай тавэрыскай крытыкі і самакрытыкі. Тады ён з посьпехам пройдзе шлях рэканструкцыі, пазнакам якое павінна ісьці яго будаўніцтва ў гэтым сэзоне. Тады ён стане на ўзровень тых задач, якія ўскладваюцца на тэатр годам завяршэньня пабудовы сацыялістычнай эканомікі.

Я. Б.

ДВУХДЭКАДНІК РАДЫЁ РАЗГОРТВАЕЦЦА НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА

ДНІ АПОШНЯЙ ПЯЦІДНЕЎКІ ЗАПОЎНІЦЬ ШТУРМАВОЙ РАБОТАЙ

„РАДЫЁ ПАЧАКАЕ ДА... ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ“

Прайшло шмат часу пасьля абвяшчэньня двухдэкадніка «дапамогі радыё», а некаторыя яшчэ нічога не зрабілі па яго правядзеньні.

Напрыклад, рэчыцкі культпроп райкому КП(б)Б заяўляе «Аб двухдэкадніку мы першы раз чуем. І наогул у нас у раёне ёсьць 9 грамадзкіх арганізацый, і тыя ніякай работы не праводзяць, а аб радыё і гаварыць няма чаго. За гэту справу мы возьмемся ўжо... у другой пяцігодцы».

Такія адносіны нельга інакш разглядаць, як злоснае невыкананьне дырэктыў Цэнтральнага Камітэту партыі.

Па Жлобінскім раёне матар'ял для абсталяваньня радыёвузла ляжыць ужо 6 месяцаў, а гарсавет не адводзіць патрэбнага памяшканьня. Такое становішча і ў Слуцку, Мазыры, Воршы, Полацку, Магілеве і інш. раёнах.

Менскі гарпрафсавет таксама яшчэ ня ўключыўся ў двухдэкадзік агляду. Адзін культработнік нават заявіў: «У мяне вельмі шмат работы, таму ў галіне радыё нічога ня зроблена».

Да канца двухдэкадніка засталіся лічаныя дні. Райкомам КП(б)В, райвыканкомам і ўсёй грамадзкасьці трэба аддаць максымум увагі для ліквідацыі прарываў на фронце радыёбудаўніцтва.

Жал.

ПАД'ЫХТАВАЦЬ ТЫСЯЧЫ РАДЫСТАЎ

Радыё — адно з найвялікшых дасягненьняў тэхнікі, сродак арганізацыі і прапаганды, сувязі і інфармацыі — дагэтуль у Беларусі не займае ў сацыялістычным будаўніцтве таго месца, якое яно можа і павінна займаць. Радыё яшчэ не скарыстоўваецца, як сродак вытворчай сувязі паміж асобнымі прадпрыемствамі, заводамі і фабрыкамі, саўгасамі і калгасамі. Вельмі нязначная пакуль яшчэ роля радыё ў быце працоўных мас гораду і вёскі.

Таварыства «прыхільнікаў радыё» яшчэ ня стала магутнай пралетарскай арганізацыяй. Яшчэ не разгорнута работа па арганізацыі новых ячэек ТПР.

Калі мы створым па Беларусі шырокую сетку масавых і моцных ячэек ТПР і мабілізуем энэргію і ініцыятыву членаў гэтай арганізацыі на работу па радыёфікацыі, дык прарыў будзе хутка з посьпехам ліквідаваны.

Усё гэта стаіць перад партыйнымі, прафэсыянальнымі і камсамольскімі арганізацыямі задачы — узмацніць тэмпы пабудовы гэтай работы, мабілізаваць усе сілы і сродкі на выкананьне і перавыкананьне пляну радыёфікацыі БССР.

Тысячы радыстаў патрэбны нам для выкананьня пляну радыёфікацыі, тысячы радыстаў патрэбны будуць Чырвонай арміі ў выпадку вайны, тысячы людзей патрэбны, каб арганізаваць масавую культурна-палітычную работу вокол радыё, каб яго выкарыстаць як можна лепш. Гэтых людзей павінны будуць даць ячэйкі таварыства «прыхільнікаў радыё».

Ня гледзячы на тое, што абвешчан двухдэкадзік агляду і дапамогі радыё і арганізацыі ячэек ТПР, гэта работа яшчэ не разгорнута. Апошнія дні двухдэкадніка павінны быць выкарыстаны для ўсямернага пашырэньня работы па радыёфікацыі і палепшэньня радыёвяшчаньня.

Жалезьнякоў.

Брыгада БелАПП'у ў Віцебску

ВІЦЕБСК, 23. (БЕЛТА). У Віцебск прыбыла брыгада пісьменьнікаў БелАПП'у ў складзе Александровіча, Хведаровіча, Ліхадзіеўскага, Красьнеўскага і Барашкі. Мэтай прыезду брыгады зьяўляецца правядзеньне на буйнейшых прадпрыемствах і ў клюбах гораду раду літаратурных вечароў. Гэта работа ўвязваецца з задачамі правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі, з выкананьнем пастановы ЦК і ЦКК КП(б)Б аб рабоце віцебскай арганізацыі і праводзіцца пад знакам закліку рабочых-ударнікаў у літаратуру.

У першы дзень прыезду пісьменьнікі былі горача спатканы рабочымі фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі», дзе было наладжана літаратурнае выступленьне. Брыгада прабудзе ў Віцебску да 27 верасьня. Атрымана шмат запрашэньняў ад фабрык і заводаў для азнаямленьня з дасягненьнямі ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну.

Культпропам РК КП(б)Б і раённым арганізацыям ТПР

У сувязі з тым, што па радзе раёнаў значная колькасьць радыёўстановак не працуе з-за адсутнасьці харчаваньня, паасобных радыёчастак і для таго, каб у бліжэйшы час гэтыя ненармальнасьці зьнішчыць, прапануецца тэрміновa ўзяць на вучот усе радыёўстаноўкі вашага раёну высьветліўшы прычыну, чаму яны не працуюць і паведаміць цэнтральнае арганізацыйнае бюро ТПР па наступнай форме: адрас устаноўкі, тып, якое харчаваньне і чаму не працуе.

Нам. загадчыка Культпропу ЦК КП(б)—Запятухін.

Адк. сакратар Цэнтральнага Аргбюро ТПР БССР — Жалезьнякоў.

Ліквідаваць ураўнілаўку ў савецкім апараце

Новая абстаноўка і новыя задачы гаспадарчага будаўніцтва прад'яўляюць вялікія запатрабаваньні да дзяржаўнага апарату, які зьяўляецца зброяй пралетарыяту ў ажыцьцяўленьні гістарычных задач пабудовы сацыялізму.

Адна з прычын недахопаў савецкага апарату — ураўнілаўка ў аплаце працы работнікаў апарату, якая не стымулюе росту прадукцыйнасьці працы, перашкаджае самазамацаванню асноўных кадраў работнікаў ва ўстановах, выяўленьню лепшых ударнікаў-энтузіястаў, часта параджае безадказнасьць, прыводзіць да адставаньня ад тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, да дрэннага абслугоўваньня рабочых мас.

Наркамфін БССР і ЦСПСБ пастанавілі паступова перавесьці дзяржаўны гаспадарчы апарат на сыстэму простай зьдзельшчыны і пачасова прэміяльнай аплаце працы.

Нядаўна адбылася нарада працаўнікоў цэнтральных установаў і гаспадарчых аб'яднаньняў гор. Менску, якая ўхваліла ініцыятыву НКП і ЦСПСБ аб пераводзе савецкага апарату на зьдзельшчыну. Нарада адзначыла, што ўвядзеньне зьдзельшчыны і гаспадарчага разрахунку, ліквідацыя абязьлічкі ў савецкім апараце зьяўляецца магутным вагаром паляпшэньня работы савецкага апарату, узьнімаюць яго на вышыню задач, высунутых у гістарычнай прамове тав. Сталіна.

Удзельнікі нарады абавязаліся дапамагчы органам НКП і прафарганізацыям ў пераводзе апарату на новую сыстэму аплаты працы. Удзельнікі нарады абавязаліся распрацаваць да 1-га лістапада дакладныя схэмы абвязкаў кожнай часткі апарату і кожнага работніка на асобку; нормы нагрузкі і паказальнікі прадукцыйнасьці працы кожнага работніка, расцэнкі працы, парадак прэміраваньня за перавыкананьне паказальнікаў.

Нарада заклікала ўсіх работнікаў: дзяржаўных, гаспадарчых і кааперацыйных установаў уключыцца ў гэтую работу.

Паведамленьні

— Дом Камасьветы. 24 верасьня, у 7 гадз. веч., у пакоі № 19—кансультацыя для прапагандыстаў першапачатковых школ на тэму: «Сучасны этап сацыялістычнага будаўніцтва».

— 24 верасьня, у 6 гадз. веч., у памяшк. Дому Камасьветы (пакой № 18) адбудзецца пасяджэньне прэзыдыуму цэнтральнага савету ваяўнічых бязбожнікаў БССР разам з прэзыдыумам Менскага Гарсавету СВБ. На пасяджэньне запрашаюцца наступныя т.т.: Лазарэвіч, Кецко, Калмык, праф. Нікольскі, Жольпэ, Шустэр, Ксяжук і Нікіціна. Таксама запрашаюцца прадстаўнікі ад культаддзелу ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ, Белкаапбожнікаў г. Менску. На пасяджэньні будзе разглядацца пытаньне аб арганізацыі антырэлігійнай вучобы. Яўка абавязкова і без спазьненьня.

— 24 верасьня, у 7 гадз. веч., у Доме Камасьветы (агульная зала) склікаецца сход партактыву ВНУ і ВТНУ—ячэек, па пытаньні: перавыбары бюро ячэек і чарговыя задачы. Прысутнасьць павінна ўсіх працаўнікоў (членаў КП(б)В) абавязкова. Білеты ў Культпропе ГК.

— 24 верасьня, у 6 гадз. веч., у памяшк. аб'яднанага бюро скаргаў ЦКК-НК РСІ БССР (Савецкая, 55, 1-шы паверх) адбудзецца пасяджэньне аб'яднанага бюро скаргаў ЦКК-НК РСІ з разглядам наступных спраў: 1) Справа настаўніка Ламаносава. 2) Справа пошты аб становішчы працы скрынак скаргаў. 3) Справа Шейніца. 4) Справа Гурыновіча Дзяніса. 5) Справа Замоскага. 6) Справа Гразоўскага аб індыв. абкладаньні. 7) Справа настаўніка Гурыновіча Яўхіма. 8) Справа настаўніка Карпажыцкага. Усе т.т., якіх гэтыя справы датычаць, павінны зьявіцца. Выклікаюцца рабочыя засядацелі т.т.: Дрозд, Лава, Саковіч, Скорабагаты, Убожык — заг. «Полымя Рэвалюцыі», Жургель, Гантвэрг — шпалерная ф-ка, Розін, Кмут, Савіцкая, Супрончык, Пінскі, Якаўлеў — «ЛК» і рабкоры.

— Менгарпрафсавет 24 верасьня, у 5 гадз. веч., у памяшк. гарпрафсавету (Плошч Волі), склікае нараду культпрацаўнікоў прадпрыемстваў, гасадарчых і навучальных установаў, кааперацыі і зат. клюбаў, па пытаньні: выкананьне пастановы ЦК і гаркому КП(б)Б, ЦСПСБ і ГСПС аб правядзеньні 2-хдэкадніка таварыства прыхільнікаў радыё. Яўка абавязкова. За няяўку будуць прыцягнуты да адказнасьці.

КЛЮБ САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ
Апошнія спэктаклі першага расійскага дзяржаўнага тэатру УЗП БССР
пад кіраўніцтвам В. В. Кумельскага.
24 верасьня „НА ДНЕ“ п'еса ў 4 д. М. Горнага.
Білеты ў раб. касе з 12-2 г. і 4-6 г., а з 6 гадз.— у касе клюбу.
Пачатак у 9 г.

„ЧЫРВ. ЗОРКА“ Пач. 7; 8-45; 10-30 — Першы гукавы мастацкі фільм Пуцёўка ў жыцьцё драма ў 34 эпізодах.
„КУЛЬТУРА“ Пач. у 7; 8-45; 10-30 — Новы мастацкі яўрэйскі фільм Чалавек з мястэчка
Інтэрнацыянал Адкр. з 12 г. дня. — Мастацкі фільм 2 БУЛЬДЗІ 2 Звыш прагр.—КІНО-НАРЫС БДК.
ПРАЛЕТАРЫ Адкр. з 12 г. дня. — Мастацкая бытавая драма ў 6 частках ВАСІЛІНА Звыш прагр. хроніка Саюзкіно № 31
„Юны Піянэр“ (будынак кіно „Культура“) — Сапраўдныя паляўнічыя кіно-фільм у 6 частках. Пач. у 1 г. 1 2 г. 30 м. Каса—з 11 г. дня.
„СПАРТАК“ Пач. 7-15, 9 і 10-45 Каса адкрыта з 5 г. — БЫТАВЫ ФІЛЬМ КАФЭ ФАНКОНІ драма ў 6 частках.

МЕНГАРСТРАХКАСА
прапануе
ўсім наймальнікам хатніх працаўніц
ДА 5 КАСТРЫЧНІКА
ліквідаваць сваю запазычанасьць
па страхузносах за хатніх прапоўніц.
Наймальнікі, якія зволілі сваіх хатніх працаўніц і да гэтага часу ня зьнялі іх з вучоту ў страхкасе, таксама павінны зьняць іх з вучоту да 5 кастрычніка. За неўзаньне вышэйпаказанага наймальнікі будуць абкладзены штрафам у разьмеры да 100 р., а належныя страхузносы будуць спагнаны ў прымусовым парадку.
МЕНГАРСТРАХКАСА.

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА ЎСІХ ПАДПІСЧЫКАЎ
НА
ТВОРЫ ЛЕНІНА
(На БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ),
што з прычыны выхаду з друку III тому твораў ЛЕНІНА з вялікім спазьненьнем, частка падпісчыкаў, перамяніўшых месца жыхарства за гэты час, не паведамілі аб новых адрасох.
Для своечасовай рассылкі III і V таму небходна ўсім падпісчікам вопасць газ. бюро новыя адрасы месца жыхарства ДА 5-ГА КАСТРЫЧНІКА, пасьля чаго падпіска будзе лічыцца мэханічна анулянай.
Друкуецца і рыхтуецца да рассылкі IV том
БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

УВАГА!
Скора выходзіць з друку першы нумар ілюстраванай навукова-тэхнічнай часопісі ВСНГ і ЦСПСБ
„ШЛЯХ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ“
Часопісь „ШЛЯХ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ“ разьлічана на шырокія колы камандзіцтва складу прамысловасьці, партыйна-камсамольскага і прафэсійнага актыву, кваліфікаваных рабочых-вынаходцаў, ударнікаў.
Часопісь „ШЛЯХ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ“ ставіць перад сабой задачу ўнядрэньня тэхнікі і сацыялістычнай арганізацыі працы на строга навуковай падставе ў прамысловасьці БССР.
Часопісь „ШЛЯХ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ“ мае аддзелы: 1) Ягуль ны; 2) Арганізацыя вытворчасьці; 3) Дасягненьні навукі і тэхнікі ў СССР і за мяжой; 4) Абмен вопытам; 5) Кадры і рабсіла; 6) На мясцох; 7) Хроніка; 8) Сярод кнігак; 9) Адказы і кансультацыі.
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: на год—3 р., на 6 м-цаў—1 р. 60 к., на 3 м.—85 к. Кошт паасобнага нумару—30 кап.
АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, Плац Волі № 21-1, ВСНГБ, 2-гі паверх пакой № 6. Тэлефон № 14-33.
За выхадам нумару сачыце ў газэтах.
Падпіска прымаецца толькі праз пошту і паштовыя агэнцтвы.

Пасяджэньне прэзыдыуму ЦК МОПР'у БССР
АДБУДЗЕЦЦА
25-га верасьня ў 7 гадз. вечара ў памяшканьні ЦК МОПР'у.
Парадак дня:
1) Даклады з месц аб ходзе рэалізацыі пазыкі „3-ці рашаючы“ і кампаніі зімовай дапамогі (дакладваюць: Чэрвень, Пухавічы, Асіпавічы, Ст. Дарогі). 2) Аб „Рагожным абозе“, надрукав. у „Інтэрн. Маяку“. 3) Укамплектаваньне ўсебеларускіх курсаў МОПР'у. 4) Аб становішчы Касьцюковіцкай, Клімавіцкай і Горацкай арганізацый МОПР'у.
Пасяджэньне камфракцыі там-жа ў 6 з пал. гадзін.
Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў прэзыдыуму і ЦК абавязкова. Просьба зьявіцца без спазьненьня. Запрашаецца актыў.
Сакратар ЦК МОПР'у БССР
Цудэін.

Беларускі Дзяржаўны будаўнічы інстытут прапануе студэнтам, прынятым па асенньнім наборы 1931 г., зьявіцца ў Інстытут (г. Менск, рог Унівэрсытэцкай і Чырвонаармейскай, 42-8) 30 верасьня ў 6 гадз. раніцы для навучальных заняткаў.
Тыя, што не зьявяцца ў паказаны тэрмін, будуць выключаны з ліку студэнтаў Інстытуту.
Заняткі на вячэрніх курсах па перакваліфікацыі тэхнікаў у іншынэры пачнуцца 1 кастрычніка г. г. у 6 гадз. вечара, ў памяшк. Будінстытуту.
Дырэктар Будінстытуту ШАЛІМА.

Настаўніца ВТНУ, адзінокая, шукае пакой.
Паведаміць: Савецкая № 141, кв. 1, настаўніцы.

Машыністка, якая ведае беларускую мову ШУКАЕ ВЯЧОРНЮЮ ПРАЦУ. Адрас у канторе газ. „Зьвязда“

25 верасьня, у 6 гадз. веч., у залі пасяджэньняў ЦСПСБ
АДБУДЗЕЦЦА
чарговы пленум Бел. МБІТ
з наступным парадкам дня:
1) Вынікі XI пленуму ЦСПСБ і задачы, што стаяць перад ІТР (дакл. т. Каменштэйн).
2) Арганізацыйныя пытаньні.
Запрашаюцца члены рэспубліканскіх і мясцовых бюро ПС і ўсе ІТР гор. Менску.
БелМБІТ.

ЗАНЯТКІ У МЕНСКІМ МЭДТЭХНІКУМЕ ПАЧНУЦЦА:
на 2-м курсе—28 верасьня, на 1-м курсе—10 кастрычніка

КУЛЬТСЭКТАР ЦСПСБ паведамляе, што
ЗАНЯТКІ ў рэспубліканскай школе ПРАФРУХУ пачынаюцца з 25 верасьня. Прыём заяў у школу працягваецца да 1 кастрычніка.